Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

КРАСАВІК 10 1933 г. № 79 (4623)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Выканаць плян дзяржаўных закупак збожжа.

Прамова тав. ЛЫЧОВА на першым усебеларускім зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў (2 стар.).

СУСТРЭЦЬ ВА ЎСЕЎЗБРАЕНЬНІ МАСАВУЮ СЯЎБУ ІЛЬНУ! (1 стар.).

Сплаў папаўся (2 стар.).

Б. Л. — Зрабіць таваразнабжэньне моцнай зброяй барацьбы за бальшавіцкае правядзеньне сяўбы (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Ангельская папраўка да пакту чатырох (4 стар.).

Напад германскіх штурмавікоў на кватэру чэскага рабочага (4 стар.).

Цеснае супрацоўніцтва вэнгерскай і германскай паліцыі (4 стар.).

СУСТРЭЦЬ ВА УСЕЎЗБРАЕНЬНІ МАСАВУЮ СЯЎБУ ІЛЬНУ!

ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ДЗЯРЖАЎНЫХ ЗАКУПАК ЗБОЖЖА

Наўрад ці трэба даказваць вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне дзяржаўных закупак збожжа. Гэта — магутная крыніца павялічэньня дзяржаўных збожжавых запасаў, адзін з важнейшых вагароў паляпшэньня снабжэньня рабочых і працоўных нашай краіны.

Таму зусім недапушчальна тое становішча, якое мы маем на фронце дзяржаўных збожжазакупак у БССР. **На 5-га красавіка рэспубліканскі плян выканан усяго на 10,4 проц.** З 33.000 тон, вызначаных плянам, закуплена толькі 3.430 тон збожжа. Гэта ў той час, калі люты і сакавік павінны былі быць асноўнымі і рашаючымі месяцамі кампаніі, калі да 1 красавіка, згодна дырэктывы партыі і ўраду, колькасьць закупленага збожжа павінна была складаць ня менш 80 проц. агульнага пляну.

Бюро ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове «пра ход закупкі збожжа», апублікаванай у «Звязьдзе» ад 6 красавіка б. т., з усёй бальшавіцкай выразнасьцю ўказвае на асноўную прычыну гэтага ганебнага прарыву. «Такое становішча, — гаворыцца ў пастанове, — зьяўляецца простым вынікам палітычнага перазмуленьня большасьцю РК і РВК, Белкаапсаюзам і Закупзбожжам усёй сур'ёзнасьці і важнасьці гэтай гаспадарча-палітычнай работы, поўнай іх бязьдзейнасьці і адсутнасьці кіраўніцтва работай закупачных арганізацый».

Сапраўды, ці ня лепшым пацьвярджэньнем гэтай ацэнкі, данай бюро ЦК КП(б)Б, зьяўляецца той факт, што за першую пяцідзёнку красавіка тэмпы закупак збожжа, замест няўхільнага павышэньня, **рэзка зьнізіліся.** Калі за апошнюю пяцідзёнку мінулага месяца было закуплена каля 1.200 тон збожжа, дык пяцідзёнка з 1 па 5 красавіка дала ўсяго 155 тон, г. зн. амаль у **8 разоў менш.**

За гэтыя 5 дзён Лоеўскі, Смалявіцкі, Стара-Дарожскі, Пухавіцкі, Полацкі, Плошчаніцкі, Уваравіцкі, Турэўскі, Талачынскі, Церахаўскі, Лепельскі, Крычаўскі, Дзяржынскі, Клічаўскі, Карманскі, Заслаўскі, Камарынскі, Жлобінскі, Ельскі, Дуброўенскі, Горацкі, Буда-Кашалёўскі, Асіпавіцкі, Бабруйскі, Барысаўскі, Бешанковіцкі і Аршанскі раёны **не закупілі ні аднаго цэнтнэра збожжа.**

Па радзе раёнаў закупкі збожжа фактычна дагэтуль яшчэ і не распачаліся. Так, **Расонскі і Сіроцінскі** раёны за ўвесь час не закупілі ні аднаго кілё збожжа. **Гарадоцкі** раён выканаў плян на 0,6 проц., **Сеньненскі** — на 0,5 проц., **Прагойскі** — на 1,6 проц., **Шклоўскі** — на 1,4 проц., **Сураскі** — на 1,1 проц., **Жыткавіцкі** — на 1,4 проц., **Асьвейскі** — на 1,1 проц. і інш.

Партыйныя і савецкія арганізацыі гэтых раёнаў не мабілізавалі на поўнае і своячасовае выкананьне пляну дзяржаўных збожжазакупак. Яны яўна недаацэньваюць важнасьці гэтай кампаніі, ня кіруюць ёю, не арганізуюць яе.

Яны забываюць аб уроках збожжазагатовак, посьпех якіх быў забясьпечан у жорсткай барацьбе з кулацтвам і яго агентурай, у барацьбе з апартуністамі, буржуазнымі перараджэнцамі, з самацёкам у рабоце загатоўчых органаў і г. д.

Раённыя арганізацыі, нарэшце, ня ўлічваюць, што, выконваючы плян дзяржаўных закупак, яны гэтым самым павялічваюць збожжавыя рэсурсы свайго-ж раёну, свайго-ж сельсавету, бо, па-першае, згодна пастановы СНК БССР, снабжэньне збожжам раёнаў і гарадоў па цэнтралізаваных і мясцовых кантынгентах ставіцца ў залежнасьць ад ходу закупкі збожжа і паступленьня гарнцавага збору; па-другое, ад кожнага цэнтнэра закупленага збожжа поўны процант застаецца ў распараджэньні снабжыўкаапэрацыі для мясцовых патрэб. **Слуцкі** раён, напрыклад, на 1-га красавіка атрымаў ужо такім чынам для мясцовых патрэб 261 цэнтн. збожжа, **Капыльскі** — 150 цэнтн., **Брагінскі** — 90 цэнтн., **Менскі** — 85 цэнтн., **Чырвона-Слабодзкі** — 64 цэнтн., **Рэчыцкі** — 53 цэнтн., **Парыцкі** — 51 цэнтн. і г. д. Адлічэньне збожжа на мясцовыя патрэбы павінна праводзіцца бяз усякіх затрымак. Бюро ЦК прапанавала ўсім РК КП(б)Б і РВК праверыць, як праводзіцца двухфунтовае адлічэньне і забясьпечыць перадачу гэтага адлічэньня ў поўнае распараджэньне сельспажыўтаварыства.

Поўная безадказнасьць, адсутнасьць сыстэматычнага кіраўніцтва закупачнай кампаніяй, разважаньні некаторых раённых кіруючых арганізацый аб тым, што, маў, «мы зрабілі сваё ў часе збожжазагатовак, а ў дзяржаўныя закупкі ўмешвацца ня будзем», — вось асноўныя прычыны зрыву пляну. Таму бюро ЦК КП(б)Б, побач з налажаньнем партсправаньняў на кіраўнікоў Асьвейскага, Быхаўскага і Бярэзінскага раёнаў, папярэдзіла «ўсіх асатніх сакратароў РК, старшынь РВК і старшынь райспажыўсаюзаў, што за выкананьне пляну закупкі збожжа яны нясуць адказнасьць у такой-жа ступені, як і за выкананьне пляну цэнтралізаваных загатовак збожжа, і бюро ЦК будзе ўжываць самыя жорсткія меры партсправаньня да тых работнікаў, якія не забясьпечаць выкананьне пляну закупкі збожжа».

Усе райкомы КП(б)Б і райвыканкомы абавязаны мабілізаваць на выкананьне пляну закупак збожжа партыйны і савецкі актыў, паставіць кан кретныя задачы ў гэтым напрамку перад кожным сельсаветам, кожнай сельпарт'ячэйкай. Зусім нельга цярпець такога становішча, што большасьць сельсаветаў і сельпарт'ячэек стаяць да гэтага часу ў баку ад закупачнай кампаніі. Сельсаветы і парт'ячэйкі павінны добра ўсьвядомець, што закупкі — справа ня толькі сельспажыўтаварыства, а ўсяго партыйнага і савецкага кіраўніцтва сельсаветам, што апошняе нясе поўную адказнасьць за правядзеньне гэтай кампаніі.

Кулак і яго агентура прыкладаюць усе сілы, каб сарваць дзяржаўныя закупкі збожжа. Яны арганізуюць такі-ж сабатаж, як і ў збожжазагатоўках, агітуюць калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў супроць продажу таварных лішкаў дзяржаве, за разбазарваньне іх на прыватным рынку. Мы ведаем шмат фактаў, калі кулакі, спэкулянты і перакупшчыкі разьяжджаюць па калгасах і вёсках, закупляюць збожжа ў калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў і перапродаюць яго па ўздутых спэкуляцыйных цэнах. Прычым гэта робіцца часта пад носам у мясцовай улады, якая не вядзе жорсткай барацьбы са спэкуляцыяй збожжам. Баявая задача ўсіх райкомаў КП(б)Б — **«узмацніць кіраўніцтва па барацьбе са спэкуляцыяй збожжам, не дапускаючы, аднак, перагібаў у адносінах да закупкі збожжа на базарах, якую робіць працоўнае насельніцтва для сваіх асабістых патрэб»** (з пост. бюро ЦК).

Трэба павесьці шырокую масава-растлумачальную работу сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, папулярызаваць дзяржаўныя закупкі збожжа і выгады, якія яны даюць працоўным. Кожны калгаснік, кожны працоўны аднаасобнік павінен ведаць гаспадарча - палітычную сутнасьць дзяржаўных збожжазакупак, усьвядоміць, што продаць свае таварныя лішкі дзяржаве зьяўляецца яго **першачарговым абавязкам.**

Весткі з месц сьведчаць, што значная частка закупленага збожжа асядае ў глыбінных пунктах, ня вывозіцца на базы Загатзбожжа. Гэта становішча зусім недапушчальнае. Белкаапсаюз і яго сыстэма, кіруючыя раённыя арганізацыі абавязаны забясьпечыць вывазку ўсяго збожжа, застрахаванага ў глыбінках, на прыстанцыйныя склады Загатзбожжа не пазьней, чым у трохдзённы тэрмін. У далейшым збожжа павінна вывозіцца з глыбінных пунктаў праз кожныя два дні.

Літаральна лічаныя дні засталіся да пачатку масавага разгортваньня веснавой сяўбы. Да гэтага часу асноўная частка пляну дзяржаўных закупак (80-90 проц.) павінна быць выканана. Гэта задача зусім рэальная. Яна будзе ажыцьцёўлена, калі раённыя арганізацыі, загатоўчая сыстэма неадкладна перабудуюць сваю работу, пройдуць ад палітыкі самацёку, ад палітыкі «няўмешваньня» да арганізацыі дзяржаўных закупак, да сыстэматычнага выразнага бальшавіцкага кіраўніцтва кампаніяй.

Разгортваючы шырокую масава-палітычную работу ў калгасах і вёсках, вядучы бязьлітасную барацьбу з кулакам, спэкулянтам і перакупшчыкам, мабілізуючы калгаснікаў і аднаасобнікаў на поўнае і своячасовае выкананьне пляну дзяржаўных закупак збожжа, бальшавікі БССР павінны дабіцца канчатковай перамогі на гэтым адным з важнейшых вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва.

У ГАРАДКУ І СІРОЦІНЕ ПАДРЫХТОЎКУ ДА СЯЎБЫ ІЛЬНУ ЗАСЛАНІЛІ ШТАМПОЎШЧЫНА І ПІСАНІНА

ЗА ШЫРМАЙ ПАКАЯНЬНЯУ

СІРОЦІНА, 6. (Наш кар.).

Перад Сіроцінскім раёнам стаіць важнейшая задача: засеяць у тэрмін і поўнасьцю 8.600 гэктараў ільну, у тым ліку па саўгасах і калгасах — 4.681 гэктар і па аднаасобным сэктары — 3.919.

Ці падрыхтаваўся раён да сяўбы? Слова фактам.

Трэба было ўжо даўно ссыпаць 5.280 цэнтнэраў насеньня ільну. Ссыпана-ж толькі 1.695 цэнтн., або 32 проц. Усякі прырост спыніўся.

Наадварот, ёсьць нават пэўнае зьнижэньне. Два месяцы назад плян ссыпкі насенфондаў быў выканан на 32,7 проц. Мінулы люты, сакавік. Лічбы ўсё тыя-ж — нават ні аднэй сотай прыросту! Цяпер красавік. Наколькі-ж выканан плян? Аказваецца, яшчэ менш чым два месяцы назад — на 32 проц. Дзе-ж 0,7 проц., або амаль 37 цэнтн. насеньня — невядома. У раёне нічога ня ведаюць, і гэта нікога ня турбуе.

Якія захады ўжывае райземаддзел? Ён перш за ўсё спадзяецца на дапамогу дзяржавы. Так, дзяржава дапамагае: адпускаецца 2.000 цэнтнэраў ільнанасеньня і, апрача таго, 1.500 цэнтн. даецца ў абмен на тэхнічнае насеньне.

Як раённыя арганізацыі павінны былі адказаць на гэту дапамогу? Ясна і зусім зразумела — бальшавіцкай мабілізацыяй калгаснікаў і аднаасобнікаў на поўны збор насеньня з мясцовых рэсурсаў.

А што робіць у раёне? Нічога. Людзі дэмабілізаваліся, апусьцілі рукі.

— Больш насеньня ў раёне няма, — такой апартуністычнай балбатнёй падмянілі сіроцінскія арганізацыі сапраўдную барацьбу за насенфонды.

Як-жа будзе, у чым выхад — ні адзін раённы работнік аб гэтым проста не ўспамінае. Паасобныя работнікі, праўда, прапануюць выхад, але...

Паслухайце які!..

Раённы аграном Фармалёў адкрыта прызнаецца:

— Ня хопіць нам каля 900 цэнтнэраў насеньня. Думаем зьменшыць норму высеву: высяваць ня 110 кілё на гэктар, а 72-80.

Камэнтары не патрэбны!

Няўжо-ж сіроцінскія арганізацыі яшчэ не зразумелі, што падобны, з дазволу сказаць, выхад ёсьць удар па ўраджайнасьці, ёсьць простае **ЗЛАЧЫНСТВА.**

Па такіх спробах трэба рашуча і бязьлітасна ўдарыць, як па шкодніцкай практыцы.

Ці ёсьць у раёне насеньне? Так, ёсьць. Ёсьць, але яно разбазараецца. Возьмеце, напрыклад, калгас імя Леніна, Старынкаўскага сельсавету.

Гэтым калгасам доўга кіравала кулацкае праўленьне ў складзе Паўлава, Гаўрылава, Лукіна і іншых. Кулацкім элемэнтам сьлепа давяраў старшыня калгасу Баранаў, тыповы, скромна кажучы, шляпа.

Кулацка-шкодніцкія элемэнты, зразумела, ня спалі. У калгасе было разбазарана амаль усё насеньне. Даволі ўказаць, што насеньня ільну калгас ня ссыпаў ні аднаго грама.

Як разбазаравалі насенфонды? Падамо яркі факт. У калгас прынялі кавалём Івана Крыжэнку. Гэта — кулак, у мінулым раскулачаны. І вось яму авансам наперад налічваюць... 764 працадні і выдаюць 40 пудоў збожжа.

Варта было выкрыць кулакоў і прагнаць кулацкае праўленьне, варта было правесьці растлумачальную работу ў калгасе, як самі калгаснікі сабралі 40 цэнтнэраў ільнанасеньня.

Факты гаворыць самі за сябе. Раённыя арганізацыі ня робяць адсюль ніякіх вывадаў. Яны па-ранейшаму перакананы, што «ў раёне насеньня няма»...

Як складаюцца вытворчыя пляны ў калгасах раёну? Райземаддзел у сваіх зводках сьцьвярджае, што пляны складзены ў 56 калгасах з 176. Такія-ж весткі пасылаюцца і ў Менск.

Людзі, аднак, займаюцца простым ашуканствам. Райземаддзел толькі штампуе лічбы. Атрымаўшы з калгасу плян у райземаддзеле, радуюцца, крычаць ура і сыпяцца хутчэй запесьці ў зводку, што яшчэ адным плянам стала больш... А як гэты плян складзен — правільна, ці няправільна — райземаддзел і ня думае.

Мы праверылі прыкладна 20 вытворчых пляноў (райземаддзел яшчэ не праверыў і не зацьвердзіў ні аднаго пляну). Што-ж аказваецца? Амаль усе пляны складзены няправільна. Пляны пішуцца, а ў калгасах брыгады або не арганізаваны, або ня маюць ніякіх вытворчых заданьняў, разьмеры ўраджайнасьці не вызначаюцца і г. д.

Некалькі фактаў.

Вось, напрыклад, калгас імя Тэльмана, Старынкаўскага сельсавету. У калгасе фармальна арганізаваны дзьве брыгады, але іх вытворчых заданьняў у пляне няма, ураджай па кожнай культуры таксама ня вызначан.

У калгасе «Чырвоная зорка» — 89 гаспадарак. Зямельная плошча складаецца з 592 га. Плян фармальна ёсьць, а вытворчыя брыгады... і да сёнешняга дня не арганізаваны.

У некаторых плянах разьмеры ўраджайнасьці вызначаны ў некалькі раз меншыя, чым гэтага патрабуюць дырэктывы партыі і ўраду.

Наглядзеце для прыкладу на вытворчы плян калгасу «Бальшавік», Казьзянскага сельсавету. У гэтым калгасе вызначылі такую ўраджайнасьць: па ільне — 1,5 цэнтн. з гэктара і па бульбе — 60 цэнтн. У калгасе «Чырвоны партызан»: па ільне — 1,5 цэнтн. і па бульбе — 75.

Няўжо-ж у райземаддзеле, у раённай МТС ня бачаць гэтых грубейшых скажэньняў? Бачаць і вельмі добра бачаць. Райземаддзел ведае аб тым, што пляны складзены няправільна, што ў плянах дапушчаны агідныя памылкі.

А як іх выпраўляюць? Ніяк. Загадчык райземаддзелу Самусевіч, дырэктар МТС Малашонак і раённы аграном Фармалёў толькі 6-га красавіка сабраліся распрацаваць... плян разгляду вытворчых пляноў. Нішто сабе апэрацыйнасьць!..

Дзе-ж прычыны такой дрэннай, злачынна дрэннай падрыхтоўкі да сяўбы ільну? Хто вінават у тым, што сяўба ільну ў раёне пад ударам?

Паслухаем спачатку раённых кіраўнікоў.

Новы сакратар РК КП(б)Б тав. Міроненка на парадзе райпартактыву гаварыў:

— Упаўнаважаныя РК у сельсаветах і калгасах настроены дэмабілізацыйна, не хварэюць за даручаную справу. Паасобныя таварышы лічаць за перамогу ўхіліцца ад паездкі на вёску. А калі і едуць у сельсаветы, дык ня ведаюць, што там робіцца. Раённыя камітэты інфармуюць паводле зводак райземаддзелу, а цана гэтых зводак надзвычай нізкая.

Загадчык аргаддзелу РК КП(б)Б тав. Шчарбакоў дадае:

— Партдні ў ячэйках не праводзяцца. Ячэйка МТС ня зьбіралася 6 месяцаў. З разы склікалі сход, але так і ня склікалі. Паасобныя (?) члены партыі не плацілі членскіх узносаў па... 15 месяцаў.

На адных паказаньнях далёка не заедзеш. Новае раённае кіраўніцтва не зрабіла патрэбных вывадаў з пастановы ЦК КП(б)Б аб былых кіраўніках раёну, не мабілізавала партарганізацыі на барацьбу за ўзорнае правядзеньне сяўбы.

Няўжо-ж раённыя кіраўнікі яшчэ не зразумелі, што хоць яны і новыя работнікі ў раёне, але іх годнасьць быць бальшавікамі, быць кіраўнікамі праявяецца іменна цяпер, на іх кіраўніцтве падрыхтоўкай да сяўбы.

Далей нельга траціць ні адной гадзіны. Сіроцінскі райком павінен неадкладна пакончыць з ганебным адставаньнем раёну ў падрыхтоўцы да сяўбы!

А. М.

САУГАС, ЯКІ МЯРКУЕ ПРАВЕСЬЦІ СЯЎБУ ЗА... 45 ДЗЁН

ПЯТРЫКОЎ, 6. (Наш спэцкар.).

У саўгасе «Пятрыкоў» ужо трэці дзень аруць. На полі працуюць тры пары коняй і два трактары. Першыя дні палявых работ ярка паказваюць, наколькі дрэнна падрыхтаваўся саўгас да сяўбы. Трактары працуюць па... 4 і 5 гадзін. Нормы ворыва ня выконваюцца.

Нават цяпер, калі пачалі араць, саўгас яшчэ не забясьпечан насеньнем. 13 сакавіка ў саўгас былі прысланы нарады на атрыманьне з іншых гаспадарак 1.045 цэнтн. насеньня розных культур — аўса, ячменю, вікі, бульбы і г. д.

Прайшоў месяц, а насеньне не атрымана. Дырэктар саўгасу па сутнасьці нічога не зрабіў, каб своячасова загатовіць насеньне для сяўбы. Толькі ў апошніх лічбах сакавіка камандыравалі для адпраўкі насеньня загадчыка вучастку № 1 Кузьміча. Ён невядома дзе праесьдзіў 10 дзён і... не адпраўсіў ні аднаго кілё.

У м. Кападзявічах паводле спэцыяльнага нараду саўгас павінен быў атрымаць насеньні ячмень. Па гэта насеньне 4-га красавіка паслалі 6 пар коняй. Праехаўшы 60 кілёмэтраў, фурманкі вярнуліся без насеньня.

Яравы клін саўгасу — 480 га. Пасеўны плян складзен, але які? Па сутнасьці шкодніцкі. Дырэкцыя так заплянавала, што сяўба ў саўгасе павінна заняць... больш **45** дзён.

Дырэктар Граноўскі для апраўданьня знаходзіць багата прычын. Яго галоўны козыр:

— У саўгасе не хапае цягавай сілы.

Скаргізяцца, што цягавай сілы не хапае, а трактары, як мы ўжо адзначылі, працуюць ня больш, як 4-5 гадзін у суткі. А як скарыстоўваюцца наяўныя коні? Як яны даглядаюцца?

На стайні — абязьлічка. Коні за паасобным рабочым не замацаваны. Сёньня на іх працуе адзін, заўтра другі. Таксама не замацаваны збруя і інвэнтар. Значная частка коняй замулена, зьбіта, ледзь цягае ногі. Конюх Гралько сыстэматычна б'е коняй, а дырэкцыя робіць від, што нічога ня бачыць, што не заўважае, як на стайні арудуе вораг.

Нарэшце, як складаўся плян? У габінэтах, бяз усякага ўдзелу рабочых. Рабочыя саўгасу па сутнасьці з планам зусім не знаёмы. На агульным сходзе рабочых плян не абмяркоўваўся. Да самых апошніх дзён рабочыя нават і ня чулі пра нормы ворыва і іншых палявых работ. На ворыве працуе хто як хоча, колькі ўзарош, столькі і добра. Адсюль і нізкая нікуды нягодная прадукцыйнасьць. На параконных плугох узорваюць менш, чым палову гектара.

Адказныя работнікі саўгасу сваю ўласную бязьдзейнасьць прыкрываюць рознымі аб'ектыўнымі прычынамі. Старшыня рабочкому Кузьміч, напрыклад, заяўляе:

— Ва ўсіх прарывах вінават трэст, а ня мы. Вышэй носа не перакочыш. Культработу весьці нельга...

Саўгас «Пятрыкоў» знаходзіцца пад бокам раённых арганізацый — ля самага раённага цэнтру. І райком КП(б)Б, і райземаддзел, і райпрафсавет добра інфармаваны аб тым, што сяўба ў саўгасе «Пятрыкоў» пад пагрозай, што патрэбны самыя неадкладныя і рашучыя меры. Людзі ведаюць, але маўчаць. Райком партыі, напрыклад, нават ні разу не абмяркаваў пытаньня аб становішчы саўгасу. Райземаддзел паогул махнуў рукой на саўгас. Аб тым, каб дапамагчы саўгасу, ён і ня думае. Райземаддзел толькі тым і займаецца, што мяркуе, як-бы набольш адхваціць пасеўнай плошчы ад саўгасу для іншых мэт. Гэтымі днямі, напрыклад, загадчык райземаддзелу Чародзік ад даў трохны загад адвесьці 80 га саўгаснай зямлі для розных раённых устаноў і арганізацый.

Старшыня райпрафсавету Кірэеў таксама парашыў па-свойму, з дазволу сказаць, дапамагчы саўгасу. Райпрафсавет паслаў у саўгас па праф работу новага чалавека. Але каго? Раней у райпрафсавеце працавала нехта Сулімскі, цяпер зьняты з работы і адданы пад суд за розныя злачынствы. Вось гэтага Сулімскага райпрафсавет і пасылае ў саўгас... для ўмацаваньня прафработы.

Аб чым усё-ж думаюць пятрыкоўскі райком, райвыканком і райКК?

Няўжо яны не разумеюць, што непасрэдная адказнасьць за сёньняшнее становішча саўгасу нясуць у першую чаргу яны самі.

РАБЦЭВІЧ.

АБ КУРАХ САКРАТАРА І САУГАСНАЙ СЯЎБЕ

МСЬЦІСЛАЎЛЬ, 6.

Саўгас Лютня-Бобрыкі — адзін з буйнейшых у раёне. Яравы клін саўгасу займае 519 га. Зразумела, што посьпех сяўбы, правядзеньне яе ў найкарацейшыя тэрміны залежыць перш за ўсё ад таго, наколькі падрыхтавана цягавая сіла саўгасу.

У гаспадарцы ёсьць 59 рабочых коняй, але працаздольнымі з іх зьяўляюцца толькі 14. Рэшта — непрыгодна да работы з-за барбарскіх адносін, з-за агіднейшай абязьлічкі, якая панае ў ка рыстанькі цягавай сілы. Дырэкцыя саўгасу не ведзе ніякай барацьбы з тымі, хто давёў да такога становішча конскае гаспадоўе.

У лютым у саўгасе была пакалечана кабыла. На працягу месяцу яна ляжала без усякага догляду, пакуль на здохла. Коняй тады даглядаў конюх Юрцэвіч. Ён-жа разгавала на гэты факт дырэкцыя саўгасу, ці прыцягнулі Юрцэвіча да адказнасьці?

Аказваецца, дырэкцыя перакінула яго на іншую работу і гатым справа скончылася. Нават у апошнія дні работніца Лабашова з-за нядбайнасьці скалечыла каня ў часе возкі гною. І на гэты факт дырэкцыя не рэагавала.

Характэрна, што кіраўнікі саўгасу ня ведаюць, што ў сапраўднасьці робіцца на стайні. Тэхнічны дырэктар Карфікарбут дасыпае весткі ў райземаддзел і трэст аб тым, што на падкорм пастаўлена 28 коняй, а дырэктар саўгасу Райчанка на агульным сходзе заявіў, што на падкорм пастаўлена 7 коняй. Фактычна пастаўлена толькі 5 коняй.

Старшы конюх Казлоў заявіў, што вэтэрынар пры аглядзе цягавай сілы выпучыў на падкорм 17 коняй. Але сьпісу яму, Казлову, ня далі, запомніўжа ён толькі 5 коняй, і вось іх і паставіў. На справе-ж і гэтыя пяць кор мяцца, як і ўсе іншыя. Так у саўгасе Лютня-Бобрыкі, з дазволу сказаць, вы конваюцца дырэктывы аб падрыхтоўцы конскай цягавай сілы да вясны.

Саўгас мае 3 трактары, але і яны яшчэ не гатовы да выхаду ў поле «Фардзоны» пасьля рамонту матораў ва пляюцца не сабранымі, а ў «Інтэрны» трэба замяніць паршневыя кольцы.

На час палявых работ для трактараў патрэбна 15 тон гаручага, завезена-ж толькі 2 тоны. Калі-б нават завезьлі і больш, дык няма куды было дзець, бо пра тару ўспомнілі толькі зараз.

У саўгасе шмат гаворыць аб барацьбе за высокі ўраджай, але робяць вель мі мала. Замест 1.500 тон гною вывезена 170. 2½ вагоны мінэральнага ўгнаеньня яшчэ валяюцца на станцыі. Насенная грэчка засьмечана сурэпнай.

Рабочы плян веснавых работ яшчэ не складзен. Брыгадам ня вызначаны вучасткі.

Склад рабочых засьмечан былымі кулакамі і раскулачанымі Раўскімі, Асмалоўскімі і інш.

На 30 чалавек рабочых у саўгасе пры падае 5 кіруючых работнікаў. Дырэктар Райчанка ў большасьці знаходзіцца ў разьездах — то ў Менск, то ў раён.

Тэхнічны дырэктар Карфікарбут зана паўся ў паперах і ня бачыць, што робіцца ў яго-ж пад бокам.

Сакратар партячэйкі Гурко галоўным чынам клепоціцца аб сваіх уласных сьвіньнях і курах. На стайні Гурко ніколі не бывае. Старшыня рабочкому Анішчук ніколі ня бывае цьвярозым.

Паўстае пытаньне, за што толькі людзі атрымліваюць грошы і лічацца членамі партыі.

НОВІКАЎ.

ІЛЬНАВОДЧЫ РАЁН, ДЗЕ ЗАБЫЛІ ПРА ЛЁН

ГАРАДОК, 6. (Наш кар.).

Не падлічыць колькі тэлеграм, інструкцый, дырэктыў і пастаноў аб сяўбе складае раённы земаддзел. Бадай, мала дзе столькі папяровай пісаніны, колькі ў Гарадку.

Людзі закапаліся ў паперах і ня бачаць, што масавая сяўба на парозе.

Перш за ўсё як у Гарадку плянуюць? У раёне, складаючы пасеўны плян, так сказаць, забылі... улічыць наяўныя зямельныя фонды сельсаветаў і калгасаў. У выніку ўсё пераблыталі, сказілі. Адны калгасы атрымалі ў некалькі разоў павялічаныя пляны, а іншыя — наадварот, у некалькі раз зьменшаныя.

Калгас «Ленінскі шлях», Кузьмінскага сельсавету, напрыклад, атрымаў такое заданьне, што, каб яго выканаць, у калгасе нехапае роўна 150 га зямлі.

А вось адваротныя факты. Райземаддзел абавязвае Язэрышчынскі сельсавет засеяць 123 га ільну. Між тым у гэтым самым сельсавеце ўжо на сёнешні дзень закантрактавана 146 гэктараў!

Пасеўныя пляны тры разы распрацоўваліся і кожны раз у сельсаветы і калгасы ляцелі ўсё новыя і новыя пляны, але так і не даляцелі...

Цяпер райземаддзел узяўся ў чацьверты раз за складаньне, як гаворыць мясцовый работнік, канчатковага пасеўнага пляну. Пакуль гэты плян складаецца, калгасы сёньня, на парозе сяўбы, ня маюць ніякіх пасеўных пляноў.

Працоўныя аднаасобнікі павінны засеяць у раёне амаль столькі, колькі і калгасы. Аднак і райком, і райвыканком, і райземаддзел менш за ўсё клапоцяцца аб падрыхтоўцы аднаасобнікаў да сяўбы.

Ёсьць шматлікія факты грубейшага, проста злачыннага ігнараваньня працоўных аднаасобнікаў. Чаго варты адзін такі факт, што ў раёне яшчэ і зараз для 106 аднаасобных гаспадарак батні і пісаніны справа не пашла не адведзена зямля. У Рудняпскім сельсавеце ёсьць даволі свабоднай незанятай зямлі, а 40 аднаасобных гаспадарак у гэтым самым сельсавеце яшчэ і цяпер ня ведаюць, дзе ім сеяць. Зямля аднаасобнікам не адведзена.

Райземаддзел нічога не зрабіў, каб выкарыстаць вопыт правядзеньня звышраньняй сяўбы ільну. Даволі ўказаць, што ў сваіх пляпах ён нават ня ўказвае тэрмінаў сяўбы — гэтага важнейшага мерапрыемства ў барацьбе за высокі ўраджай. Якія землі павінны быць адведзены пад лён і колькі ў кожным сельсавеце — сам райземаддзел нічога ня ведае.

Калгасы павінны ссыпаць 7.448 цэнтнэраў ільнанасеньня і аднаасобнікі — 7.028. Колькі-ж ссыпана? Па калгасах усяго 4.672 цэнтн. Што-ж датычыць аднаасобных гаспадарак, дык у райземаддзеле ня маюць ніякага ўяўленьня. Людзі проста скінулі аднаасобніка з рахунку.

Такія ганебнейшыя лічбы ссыпкі насенфондаў нікога ў раёне ня турбуюць. Усе спадзяюцца на дзяржаўную пазыку. А самі сьпяць, самі літаральна нічога ня робяць.

На вачох раённых арганізацый разбазарваюцца насенфонды. У калгасе «Калектывіст», Пралетарскага сельсавету, яшчэ да ссыпкі насенфондаў усё насеньне падзялілі паміж калгаснікамі. Раздалі насенфонды каму толькі хочаце і ў калгасе «Чырвоны сьцяг». Такія-ж факты мелі месца ў калгасе «Сьцяг працы» і іншых.

Шматлікія выпадкі разбазарваньня і раскрадваньня насеньня не паслужылі ўрокам для раённых арганізацый. На справе нічога ня зроблена, каб праверыць наяўныя насенфонды і забясьпечыць іх захаваньне.

Праўда, райКК гэтай справай прабавала займацца. Яшчэ ў лютым у габінэце старшыні райКК тав. Лазоўскага сабралася вялікая куча розных актаў, дакумантаў і вестак. Але далей балбатні і пісаніны справа не пашла.

У Гарадку шмат гаворыць аб барацьбе за ўраджай. Прымаюць пастановы, дырэктывы і пастаноў, даюць прыгожыя абяцаньні і г. д. без канца. Справы-ж не відаць. Ачыстка насеньня праводзіцца зусім нездавальняюча. Аднаасобны сэктар, напрыклад, ачысьцілі усяго... 151 цэнтн. ільнанасеньня. Ня лепш і з вывазкай гною. Калгасы павінны вывезьці 207.100 возоў, вывезена 32.584. Дасланае ў раён мінэральнае ўгнаеньне валялася пад адкрытым небам да таго часу, пакуль палова яго ня прышла ў поўную непрыгоднасьць. І на сёнешні дзень ня скончан рамонт інвэнтару. Трэба адрамантаваць яшчэ 500 плугоў і столькі-ж барон.

Да чаго прыводзіць такая бязьдзейнасьць, такая штампоўшчына, такое шляпнае кіраўніцтва? Ясна і бяз слоў. У раёне сяўба ільну пастаўлена пад сур'ёзную пагрозу, асабліва па аднаасобным сэктары. Паасобныя вёскі ў Канчанскім і Язэрышчанскім сельсаветах пад уплывам кулацкай агітацыі адмаўляюцца сеяць лён. Кулак ня сустракае ніякага адпору. Масавая работа сярод працоўных аднаасобнікаў не праводзіцца.

У заключэньне адзін факт. Райземаддзелам, з дазволу сказаць, кіруе нехта Шнэйдэр, у мінулым вычышчаны з партыі. Цяпер яго чамусьці зноў прынялі ў кандыдаты КП(б)Б.

У райкоме добра ведалі, што Шнэйдэр не спраўляецца з работай, што ён сабатуе веснавую сяўбу. Ведалі, але невядома з-за якіх меркаваньняў ня толькі давяралі кіраваць райземаддзелам, але і зноў прынялі яго ў партыю. Толькі гэтымі днямі, бюро райкому ўхваліла пастанову зьняць Шнэйдэра з работы. Ухваліла і... забыла. Шнэйдэр па-ранейшаму сядзіць у райземаддзеле...

Штосьці незразумела!..

АРК. З.

Тав. Гікало — у Віцебску

ВІЦЕБСК, 9. (БЕЛТА). 8-га красавіка ў гарадзкім тэатры адбыўся сход партактыву гораду. Партактыў з вялікай увагай заслухаў даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гікало аб веснавой сяўбе і задачах КП(б)Б. Абгаварыўшы даклад, сход партактыву ў сваёй пастанове запэўніў ЦК КП(б)Б і тав. Гікало, што бальшавікі Віцебшчыны забясьпечаць бальшавіцкія тэмпы ў правядзеньні сяўбы.

Тав. Гікало наведаў буйнейшыя прадпрыемствы Віцебску — фабрыку «Сьцяг індустрыялізацыі», а таксама «КІМ», «Клары Цэткін» і інш.

ПАЛІТАДДЗЕЛ РАЗГОРТВАЕ РАБОТУ

ДЗЯРЖЫНСК, 9.

Да арганізацыі палітаддзелу саўгас імя Сталіна цягнуўся ў глыбокім тыле. Падрыхтоўка да сяўбы ў саўгасе зусім не была разгорнута. У асяродзішча рабочых пралезьлі варожыя кулацкія элемэнты, якія імкнуліся разбурыць гаспадарку.

Палітаддзел правёў рашучую ачыстку саўгасу ад варожых элементаў. Вычышчана 13 чалавек.

Праведзены канкрэтныя мерапрыемствы па перабудове партыйнай і камсамольскай работы. На ўсіх вучастках падрыхтоўкі да сяўбы правільна расстаўлена рабочая сіла. Цяпер саўгас выходзіць з пасіўнасьці. Паміж рабочымі разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва. Саўгас энэргічна завяршае падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ПРАМОВА тав. ЛЫЧОВА НА ПЕРШЫМ УСЕБЕЛАРУСКІМ ЗЬЕЗЬДЗЕ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

Таварышы калгасьнікі і калгасьніцы! Дазвольце мне від імя работнікаў РСІ вітаць першы з'езд калгасьнікаў-ударнікаў і дакладаць вам ня толькі тут, робячы прамову і прымаючы рад пастановаў, але там, на полі, гэтыя абавязацельствы выкананьць на ўсе 100 проц. (Аплёдысмэнты).

Наш з'езд калгасьнікаў-ударнікаў, як тут гаварыў ужо тав. Шарантовіч, сабраўся якраз у той перыяд, калі мы толькі што падвялі вынікі вялікарнейшым посьпехам нашай першай пяцігодкі і варвае ўступаем у другую пяцігодку, у гэту першую вялікую, бальшавіцкую вясну другой пяцігодкі.

Наша партыя сабрала вас сюды для таго, каб яна толькі падвесьці вынікі пройдзенага шляху, але і для таго, каб разам з вамі намеціць далейшыя шляхі разьвіцьця нашага калгаснага будаўніцтва. Мы сабраліся тут для таго, каб нікто не адважыўся сказаць, што калгаснае будаўніцтва, як гэта гаворыць заграніцай, будуецца ў нашай краіне гвалтоўна, з дапамогай бізуна ўганяючы сялян у калгасы і потым у гэтых калгасах сялянства не зьяўляецца гаспадаром гэтых калгасоў. Мы сабраліся тут для таго, каб мы з гэтай трыбуны самі сказалі і праз гэту шаноўную станцыю, якая перадае нашу размову ня толькі па нашай Беларусі, але і далёка за яе межы, аб тым, як мы самі стаім указаным рокуцам, сваімі ўласнымі сіламі пад кіраўніцтвам пралетарыяту будуем сацыялістычнае будаўніцтва нашай калгаснай гаспадаркі, як мы самі ўмеем будаваць і кіраваць гэтымі калгаснымі гаспадаркамі і як мы самі тут можаце заўважыць усяму сьвету, што мы можам тым вялікарным дасягненьні, аб якіх таварыша наша партыя на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК вусклаў нашага любімага правадыра тав. Сталіна.

Савецкі саюз у першай сваёй пяцігодцы здолеў ня толькі замацаваць свае пазіцыі сацыялістычнага будаўніцтва, але і пасунуць тэмпамі кроках сацыялістычнае будаўніцтва наперад. Мы замацаваліся на гэтым сацыялістычным шляху. Зараз мы робім другі крок, больш магутны, больш моцны. Мы ўмацоўваем нашы калгасы, умацоўваем іх гаспадарку, умацоўваем іх арганізацыйна. Прамова тав. Сталіна, якую вы тут з гэтай трыбуны ня раз цыталі, нашы калгасьнікі і калгасьніцы напамяць ведаюць. Яны праводзяць рад мерапрыемстваў з тым, каб зрабіць калгасьнікаў сапраўды асмоснымі. І ўжо ня раз падкрэсьлівай, што ворагі савецкай улады, ворагі сацыялістычнага будаўніцтва, ворагі калгаснага будаўніцтва ўжо на гэтай прамове спарадзіла пабудаваць новыя пакляпы на калгаснае будаўніцтва. Тут вельмі яркі аказаўся прыклад таварышы ангітацыю гэтых кулакоў, якія гаворыць аб тым, што вас, калгасьнікаў, савецкая ўлада хоча зрабіць замоснымі, а потым вас будуць расстрэльваць. Я думаю, што пасьля гэтага з'езду вы дасьцё самы рашучы адпор гэтым вылазкам нашых калгасных ворагаў, дасьцё на справе адпор і пастараецеся паставіць сваю калгасную работу так, каб у нас ня было кулакоў, каб нашы калгасы сталі-б калгасамі сацыялістычнымі, вядучымі калгасамі, у якіх-б улілася новая хваля працоўнага сялянства, і тое, што мы тут чуем, — гэта гаворыць імя, што наша калгаснае будаўніцтва стаіць на правільным шляху і далейшае разьвіцьцё базумоўна гарантавана.

Чаму мы дабіліся такіх посьпехаў? Таму, што савецкая ўлада, наша камуністычная партыя паставілі перад сабой задачу перабудаваньня нашай сельскай гаспадаркі. Партыя пры гэтым выходзіла з таго, што без калектывізацыі немагчыма вывесьці нашу краіну на шырокую дарогу пабудовы эканамічнага фундамэнту сацыялізму, немагчыма ажыцьвіць шматмільённую масу сялянства ад галечы і нецярпіма. Вось як аграмадзіраваў тав. Сталін нашу пазыцыю калгаснага будаўніцтва. Мы гэта зрабілі. Ленінская пазыцыя, ленінская ідэя грандыёзнай ашрапоўкі вясьці цяпер ужо ператворана ў жыцьцё. Мы маем вялікарную колькасьць калгасаў, у якіх мільёны працоўных — бядняцкай і серадняцкай — зараз праводзяць вялікарную работу ў сэнсе арганізацыі ленінскага будаўніцтва. І цяпер, калі гэта першая пазыцыя нам ўжата, ясна, што ворага стаіць за вамі, за калгасьнікамі, калгасьніцамі і гэта будуе будаўніцтва, вялікарны прарэс нашага калгаснага будаўніцтва ўжо гарантаваны імённа тым, што вы, якія сышліся сюды, сваімі ўласнымі вусамі памечаце далейшыя шляхі разьвіцьця гэтага калгаснага будаўніцтва. Большасьць з вас ведае, як жылі сяляне раней, ведаюць, як цры капіталістычным ладзе сялянства гінула ад галечы і эксплуатацыі, яны былі цёмнымі і забітымі. Кулакі эксплёатавалі сялянства, выпіваючы з яго ўсе соікі. І т. Ленін, наш настаўнік і правадыр, якіх ня стаім жыцьцё ўказаў тыя шляхі, па якіх павінна было пайсьці сялянства, па якім яно пайшло і ідзе зараз гігантскімі крокамі.

Тав. Ленін гаварыў наступнае: «Сялянін быў даведзен да жабрацкага ўгроўню жыцьця: ён зьмяшчаўся разам са скацінай, апранаўся ў лахманы, кармілся лебадой, сялянін уцякаў ад сваіх жалезяк». І асабліва гэта ўцякаьне было разьвіта ў нас у заходняй частцы старой царскай Расіі.

Сяляне сапраўды ўцякалі ў розныя месцы, шукалі месца, дзе прыкласьці свае рукі да працы. Частка сялянства адкулялася ад надзелаў. Сяляне гадалі і дзесяткамі тысяч шарэлі з голаду. Гэта пагібель заўсёды была вялікай. І тав. Ленін далей гаварыў наступнае: «што дробным сялянскім гаспадаркам з галечы ня выйсьці». «Толькі шры дапамозе агульнай арцельнай працы можна выйсьці з таго тупіка, у які, залазла іх імпэрыялістычная вайна» Нязгаш Ул. Ільіча Леніна аб рэканструкцыі сельскай гаспадаркі наша партыя праводзіла і праводзіць.

І зараз вы тут падлічаеце ільготы, якія дасягнулі нашы калгасы. Імённа, якімі чым вы самі гаворыце аб нашым калгасным будаўніцтве — ці адзін з нашых прамоўцаў ня сказаў і ня трэба тлумачыць падбіраць словы для таго, каб характарызаваць усё гэта будаўніцтва. Гэтыя словы сказаны з гэтай трыбуны разам настаўніцы, жанчыны, сяляніна, яны сьцьвердзілі, што вяскоўцы ў калгас, фальтруйце добра тых, хто ідзе ў ваш калгас, прапічуйвайце кожнага з усіх бакоў, з тым, каб той, хто ўжо увойдзе ў калгас, каб ён усёй душой, усе сілы аддаў на калгаснае будаўніцтва. Такога аднаасобніка трэба прымаць у калгас.

Зараз, таварышы, ня гледзячы на тое, што ў нас 45,4 проц. калектывізаваных гаспадарак—гэтыя гаспадаркі ўладаюць 52 проц. самай лепшай зямлі ў Беларусі. Ясна, што на гэтай лепшай зямлі мы можам дабіцца ажыцьцяўленьня тых задач па ўрадкаваньню, якія стаяць перад усімі партыя і ўрад. Апрача таго, што ў вас ёсьць у калгасах, на нашых палёх Беларусі яшчэ працуюць тысячы (дакладна 3½ тыс.) трактараў, якія дапамагаюць калгасам узараць, сеяць, жаць, касіць і т. д. Гэта значыць — ёсьць малутная тэхнічная база, якую паставіла партыя і ўрад на дапамогу калгаснаму будаўніцтву Вакол гэтай базы вам лёгка будзе арганізаваць давейшы ўрачысты ход калгаснага будаўніцтва. Рад калгасаў сапраўды зразумелі гэту задачу, зразумелі задачу ўмацаваньня як арганізацыйна, так і гаспадарча нашых калгасаў і робяць гэта з вялікім гонарам. Я прыязду вам некалькі прыкладаў, як працуюць у асобных калгасах. Вось у нас ёсьць даныя з калгасу імя Варашылава, Менскага раёну. Ураджай у гэтым калгасе з гектара збожжавых у 1931 годзе быў 7½ цэнтн., а ў 1932 г. яны дабіліся 8,3 цэнтн., тады як у аднаасобніка побач з гэтым калгасам ураджайнасьць была 5,7 цэнтн. Варашылаўцы здолелі паставіць правільна работу ў сваім калгасе і тому палепшэньне жыцьця калгасьнікаў у гэтым і ў радзе іншых калгасаў базумоўна ідзе шпаркімі тэмпамі. Так у результаце павышэньня прадукцыйнасьці працы вырасла і дахадзнасьць гэтага калгасу, пакінуўшуся аб'ём прадукцыі, адданай дзяржаве, павялічыліся грашовыя паступленьні ад калгаснага таварообіг. На адзін працадзень у гэтым калгасе ў 1931 г. прыпадалася збожжа 1,7 кгр., а ў 1932 г. — 2,7 кгр., значна павысіўся ўраджай бульбы.

Я мог-бы прывесьці цэлы рад такіх калгасаў у нас у Беларусі, якія сапраўды працуюць не за страх, а за сумленьне і паставілі сваю гаспадарку вельмі добра. Аднак, таварышы, ёсьць і цэлы рад такіх калгасаў, якім вельмі і вельмі трэба падцягнуцца. З боку многіх калгасьнікаў ёсьць вось якія разважаньні, на якія трэба таксама зьвярнуць вялікую ўвагу. Яны характарызуюць рост нашых калгасаў і палепшэньне быт калгасьнікаў.

* Вось на раённым зьезьдзе калгасьнікаў у Веткаўскім раёне калгасьніца Дубровская сказала: «Я бедная ўдава, да ўступленьня ў калгас ня мела каровы, калека хлеба, баялася ўступіць у калгас, бо кулацтва цалкала, што ў калгасе я памру з голаду. Цяпер я не шкадую, што ўступіла. Ад ураджаю 32 году я атрымала 200 пудоў бульбы, 10 пуд. жыта, 18 пуд. ячменю і рад іншых культур, аб чым я ніколі не магла марыць, жывучы аднаасобніцай».

Але ёсьць разважаньні зусім іншага парадку. Ёсьць калгасьнікі, якія гавораць: «мы працуем, а калі будзем атрымліваць, дык атрымаць нішта чаго». Гэта такія калгасы, у якіх работнічыя ня любяць працаваць, а любяць гутарыць і чакаюць, пакі хто-небудзь за іх папрацуе А ў нас, таварышы, паставлена так: «Хто не працуе, той і ня ёсьць» (аплёдысмэнты).

Таварышы, усіх гэтых дасягненьняў мы дабіліся толькі дзякуючы таму, што наша ленінская партыя, пад кіраўніцтвам вялікага любімага правадыра сусьветнага пралетарыяту тав. Сталіна вела гэтых калгасьнікаў па правільным ленінскім шляху. Партыя дапамагала калгасьнікам зьяжджаваць праваныя кулацкія элементы, ачышчала гэтыя калгасы ад кулацкіх элементаў, партыя на сваім шляху ачышчала усю нечысьціць, якая пераважала ў калгасным будаўніцтву, так і будаўніцтву ленінскага партыі і яе правадыра тав. Сталіна базумоўна, пераможа (аплёдысмэнты)

трыбуны вусцамі калгасьнікаў і калгасьніц вы тут нам заўважыце. І гэта ў той перыяд, калі побач з вамі, недалёка ад нас — за некалькі кілёметраў Польшча, яшчэ далей — Германія, Англія, Францыя, дзе мільёны працоўных руйнуюцца з кожным днём, прыгнечаныя эканамічным крызісам, дзякуючы якому яны кідаюць свае гаспадаркі і ўцякаюць са сваіх палёў. Пасеўныя плошчы з году ў год зьмяншаюцца: выраб сельска-гаспадарчых машын з кожным годам падае. Такая краіна, як Злучаныя Штаты Амэрыкі, з 1929 г. па 1932 г. па вырабе с.-г. машын упала на 83 проц., па Германіі — на 72 проц. У Польшчы амаль зусім спынен выраб с.-г. машын. Беспрадоўем ва ўсіх капіталістычных краінах ахоплена больш 40 мін. людзей, тады як у нас нашы фабрыкі і заводы адчуваюць патрэбу ў рабочых руках, тады як нашы фабрыкі і заводы па вырабе с.-г. машын з кожным годам усё больш і больш павялічваюць сваю праграму, калі патрэба ў іх у нас з кожным годам, дзякуючы таму, што мы перайшлі ад дробнай сялянскай гаспадаркі да буйнай, калгаснай — увесь час расьце.

Тут правільна ўказаў адзін таварыш на тое, што мала таго, каб атрымаць добрыя машыны. Трэба добра берагчы гэтыя машыны і зусь вы, таварышы калгасьнікі-ударнікі і ўдарніцы, едучы з гэтага зьезду, павінны будзеце даць такое абяцаньне нашаму ўраду і партыі, што вы ўсімі мерамі і сіламі паладзіце догляд і хаваньне гэтых складаныйшых машын, якія партыя і ўрад падаюць вам. Трэба навучыцца добра ўладаць імі. Машына патрабуе, каб яе правільна аберагалі, тады яна можа даць вялікую прадукцыйнасьць.

Таварышы, я хацеў-бы прывесьці яшчэ рад прыкладаў аб тым, як часамі ў выніку дрэннай работы, побач адзін калгас ідзе ўгару, а другі калгас падае з дня ў дзень, але часу ня хопіць. Калгасы бываюць слабыя толькі з прычыны таго, што ў іх слабае кіраўніцтва. А чаму ў нас бывае слабае кіраўніцтва ў калгасах? Там, дзе масы калгасьнікаў адчуваюць сябе гаспадарамі ў калгасе, там, дзе яны змагаюцца за тое, каб выбраць добрага старшыню ў калгасе, паладзіць добрых памочнікаў, кіраўнікоў, працаўленьне калгаснае, там калгасьнікі жывуць і працуюць добра, а там, дзе калгасьнікі ня прымаюць актыўнага ўдзелу ў гэтай справе, там калгасы развальваюцца.

Імённа таму, што на гэтым зьезьдзе вызначэна рад вельмі добрых работнікаў і работніц—калгасьнікаў, я заварэшу ўвагу на тым, каб вы, разьехаўшыся адсюль, у падрыхтоўцы сяўбы на мясцох, узяліся ў першую чаргу за перагляд сваёх кіраўнікоў, як яны самі гатовы да кіраўніцтва гэтай бальшавіцкай вясной, як яны расставілі свае ўласныя сілы, у тым ліку і вас, брыгадзіраў, на адпаведныя месцы. І хто ня здолее гэтага зрабіць, хто не зразумее, што вяна—гэта імённа тая вялізарная задача, якая вырашае работу на цэлы год, той будзе дрэнным калгасьнікам, дрэнным актывістам.

Я думаю, што пасьля гэтага зьезду вы здолееце выпучыць дзесяткі і сотні жанчын на ўдарныя пасты нашых калгасаў (аплёдысмэнты).

Тут гаварылі аб рамонце машын. Апошняя зводка, якую мы маем, гаворыць аб тым, што ў большасьці калгасаў рамонт машын амаль закончан, але ёсьць рад калгасаў, у якіх гэты рамонт сцягнуўся не закончан, і тому трэба ў першыя дні вашага прыезду прыняць усе меры да таго, каб рамонт машын быў-бы закончан своячасова, каб вы выйшлі з добрымі машынамі на поле, што гарантуе хуткае скончэньне сяўбы, хуткае скончэньне рашыяй сяўбы.

Па пытаньні аб калі. Я думаю, што лепш ня скажан таго, што сказаў учора той чырвонаармеец-кавалерыст, які тут гаварыў пра коня. Я думаю, што зьезд калгасьнікаў-ударнікаў прыме тое, што сказаў чырвонаармеец-кавалерыст, як праграмнае рашэньне для таго, каб імённа так, па-ваеннаму, як сказаў вам гэты чырвонаармеец, узяцца за сьцяць за калём (аплёдысмэнты).

Ня гледзячы на тое, што тысячы машын у нас кінуты на калгасныя палі, конь яшчэ ва ўмовах Беларусі зьяўляецца пакуль што рашаючай сілай, а калі мы гэту рашаючую сілу не падбярам так, каб яна была сапраўды гатова да бою, тады будзе дрэнна, тады мы правалім нашу бальшавіцкую вясну.

Апошняе, на чым я хацеў-бы спыніць вашу ўвагу па абавязку маёй служ бы і работы. Рабоча-сялянская інспэкцыя называецца рабоча-сялянскай імённа таму, што ў яе радах павінны працаваць дзесяткі тысяч, сотні тысяч, мільёны рабочых і сялян, для таго, каб праверыць усю тую вялізарную гаспадарку, якой мы ўладаем у сучасны момант. Мы з прыватнай, дробнай сялянскай гаспадаркі перагварыві краіну ў магутную калгасную краіну, якая падкідае калгасьнікам мільёны лепшых малпын, лепшыя землі адводзяцца гэтым калгасьнікам. У гэтых калгасьнікаў расьце гаспадарка, за якой павінны сачыць самі калгасьнікі, самі працоўныя масы калгасьнікаў. Я з гэтай трыбуны дазволю сабе сказаць вам аб тым, што вы сёньня вечарам атрымаеце маленькую анкету ў 3-4 пытаньні аб тым, хто з вас пажадае быць ударнікам на палёх, весьці барацьбу з рэшткамі ворагаў савецкага ладу і нашай партыі (аплёдысмэнты).

Нягай гэтыя таварышы, якія пажадаюць весьці рашучую, непрымірымую, бальшавіцкую барацьбу з рэшткамі ворагаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, шкодзяць нашаму савецкаму, сацыялістычнаму будаўніцтву,—запішуць сваё імя, сваё прозьвішча, укажуць сваё месцажыхарства, і мы здолеем арганізаваць з вас калгасьнікаў-ударнікаў байцоў РСІ'стаў, якія створаць у сваіх калгасах і суседніх такія магутныя калгасныя РСІ'скія пасты, якія будуць пільна сачыць за ворагам. І тым, дзе гэты ворог спажывіна пасяг нуць на нашу савецкую ўладу і калгасную сацыялістычную гаспадарку, мы здолеем своячасова паправіць і даць такі адпор, каб ён ніколі ў жыцьці не пажадаў яшчэ раз паправаць гэту справу (аплёдысмэнты).

Я думаю, таварышы, што нашы аплёдысмэнты будуць пацьверджаны актыўнай работай нашай як на палёх, так і ў барацьбе з рэшткамі капіталістычных элементаў, пта знаходзяцца яшчэ ў нашай краіне. І мы разам з вамі, але ды фронтам пад кіраўніцтвам нашай ленінскай партыі і яе правадыра тав. Сталіна базумоўна, пераможам (аплёдысмэнты)

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЗАВЯРШЫЦЬ КАЛДАГАВОРНУЮ КАМПАНІЮ

Самаабавязацельствы будуць выкананы

На швейнай фабрыцы «Кастрычнік» праверка калдагавору была арганізавана, як масава-палітычная кампанія, накіраваная на ўзьдым актыўнасьці рабочых у справе забесьпячэньня выкананьня прамфінпляну першага кварталу 1933 году і выкананьня пастаноў студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Праверка паказала, што калдагавор ня выкананы па зьніжэньні сабекошту, зарплаце і па зьнішчэньні прагулаў.

Трэба сказаць, што пастановы ЦВК і СНК СССР аб звальненьні за прагулы па найважнейшых прычынах дырэкцыяй фабрыкі не выконваюцца. За апошні час прагулы павялічыліся. У студзені было 26 прагульшчыкаў, зволена толькі 10 чалавек, вымову атрымала 5 чалавек. За люты месяц было 34, зволена 10 чалавек, вымову атрымала 2. Да астатніх зрыўшчыкаў прамфінпляну адміністрацыя мер не прыняла.

Пасьля праверкі калдагавору брыгады адзначылі, што адміністрацыя ў 1932 г. не наладзіла дасканалага ўліку браку і перарабак і таму, паводле пляну перарабкі павінны былі капітаваць 14.796 руб., а фактычна капітавалі—29.906 руб.

Выяўлена, што з боку фабкому ня была выстарчальна мабілізавана грамадзкасьць на барацьбу за якасьць прадукцыі, не вялося амаль ніякай работы з грамадзкімі інспэктарамі па якасьці прадукцыі і інш.

За час перазаключэньня калдагавору ад рабочых паступіла 108 прапаноў, з іх вытворчага характару—58, астатнія—бытавыя і інш.

На фабрыцы налічваецца 1.384 ўдарнікі, (80 проц. да агульнага ліку рабочых). Створана 30 гаспадарча-разрахункавых брыгад. Па ініцыятыве рабочых практыкуецца правядзеньне штодзённых зьменна-сустрэчных прамфінпляну. У кожным цэху ёсьць чорная і чырвоная дошкі, на якія заносяцца добрасумленныя ўдарнікі-барацьбіты за прамфінплян, і ілжэўдарнікі. Лепшыя ўдарнікі (255 чал.) за выкананьне прамфінпляну прэміраваны на суму 25.055 руб.

На фабрыцы зьдзельнічнай ахоплена 87 проц. рабочых. Для зьніжэньня ўрэгулёўкі праведзена дыфэрэнцыяцыя ў сыстэме зарплаты. Уведзены процантныя прырабаткі для кожнага разраду, вылучаны вядучыя апэрацыі ў 1933 г.

Калдагаворная кампанія прайшла з вялікім уздымам рабочых. Разгарнулася заключэньне сацдагавораў паміж рабочымі. 26 гаспадарча-разрахункавых брыгад узялі на сябе самаабавязацельствы па 100-процантным выкананьні прамфінпляну, паляпшэньні якасьці выпускаемай прадукцыі, павышэньні прадукцыйнасьці працы, ліквідацыі прагулаў, па 100-проц. удзеле рабочых у абмеркаваньні перагляду норм калдагавору 1933 г.

Значны зрух ёсьць у выкананьні прамфінпляну першага кварталу 1933 году. Калі ў студзені плян быў выкананы на 98,5 проц., дык за час калдагаворнай кампаніі ў лютым—99,1 проц., а ў сакавіку—104,2 проц.

Нельга абыйсьці вынікаў, якія маюцца і па агрэгатах пасьля ўзяцьця абавязацельстваў брыгадамі.

Да перагляду калдагавору першы агрэгат у сакавіку выканаў прамфінплян на 99,5 проц., другі—98,5 проц. і трэці агрэгат—103,3 проц. Пасьля перагляду ёсьць значныя дасягненьні. З 1 сакавіка па 3 красавіка першы агрэгат выканаў прамфінплян на 106,3 проц., другі—100,6 проц. і трэці агрэгат—108,2 проц.

З красавіка рабочыя швейнай фабрыкі «Кастрычнік», на агульным сходзе абмеркаваўшы па пунктах новы калдагавор 1933 г., абавязаліся выканаць новыя нормы на 100 проц., павысіць прадукцыйнасьць працы і якасьць прадукцыі. Рабочыя запэўняюць, што бальшавіцкія самаабавязацельствы будуць выкананы.

Р.

Першы мясцовы калдагавор будзе намі выканан

Па службе цягі з 20 сакавіка разгарнулася кампанія па перагляду норм у новы калдагавор 1933 году, у якой прымала ўдзел 100 проц. рабочых. За час кампаніі паступіла ад рабочых 108 прапаноў, з іх унесена ў калдагавор 23, рэшта перадана на вытворчыя нарады і мясцовую згоду.

Паравозны цэх — машыністы, памочнікі, качагары — у часе калдагаворнай кампаніі добраахвотна зьменшылі час на прыём і здачу паравозаў. У 1932 годзе на прыём пасажырскіх паравозаў трацілася 3 гадзіны, зараз—дзьве з паловай гадзіны, па таварных была норма прыёму дзьве з паловай, а зараз 1,83 гадзіны. Такім чынам павялічваецца прадукцыйнасьць працы па пасажырскіх паравозах на 13 проц. і па таварных — на 8 проц.

Нарміратары па рамонту паравозаў сумесна з рабочымі брыгадамі выявілі па брыгадах кавалёў аўна паніжаных 35 норм, з іх перагледжаны ўсе.

Сьлесары-аўтаматчыкі выявілі паніжаных 17 норм. Часу да перагляду было 106 гадзін, пасьля перагляду ўсе 17 норм атрымалі 98 гадзін. Эканомія часу 7,6 проц. і ў грашох—5,9 проц.

Усяго па дэпо выяўлены і перагледжаны 342 зьніжаныя нормы. Часу да перагляду было 1.412 гадзін, пасьля перагляду 1.226 гадзін. Такім чынам атрымалі зьмяншэньне часу 13,2 проц. у грашох 6,5 проц.

Сьлесары-акупіроўшчыкі па старому дагавору прадавалі бяз норм. У новым калдагаворы на 1933 год выпрацавалі нормы і пераводзяцца ўсе на зьдзельшчыну. Ад гэтага рабочыя атрымаюць павышэньне прадукцыйнасьці працы, зьніжэньне сабекошту, значна палепшыцца якасьць прадукцыі і павысіцца зарплата.

Дзякуючы разгорнутаму сацспаборніцтву і ўдарніцтву паміж машыністамі, памочнікамі і качагарамі, трансфін плян па прабежнай норме выканан за студзень на 101 проц., за люты—на 103 проц.

На агульным сходзе чыгуначнікаў пры канчатковым зацьвярджэньні калдагавору паравозныя брыгады, машыністы, памочнікі і качагары пасажырскіх і таварных цягнікоў высунулі сустрэчны плян—павялічыць месячную норму прабегу на 100 кілёмэтраў. Брыгады заверылі агульны сход, што першы мясцовы калдагавор будзе імі выканан.

Галоўных сацыялістычных абавязацельстваў па павышэньні прадукцыйнасьці працы, зьніжэньні сабекошту, паляпшэньні якасьці прадукцыі, ліквідацыі прагулаў і т. д. мясцком цягі па сёньнішні дзень ня мае.

Старшыня мясцкому тав. Купрэеў тлумачыць сваю бязьдзейнасьць тым, што ў часе калдагаворнай кампаніі былі заняты падрыхтоўкай да пасеўнай кампаніі, як відаць, ён забывае, што не павінна быць чарговасьці кампаніі. Купрэеў і ўвесь прафактыбуд цягі не зьвярнулі ў сваёй практычнай рабоце належнай увагі на тэхнічнае нармаваньне, як на важнейшы элемэнт, і ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы.

Тэхнічнае нармаваньне ў нашым паравозным дэпо яшчэ не знайшло ў штодзённай рабоце кожнага цэху, кожнай брыгады і кожнага рабочага пасобку свайго адлюстраваньня. Гэта вынік таго, што справа тэхнічнага нармаваньня пастаўлена зусім дрэнна. Рабочыя ня ўцягнуты ў гэту работу, што і прывяло да няправільнага вызначэньня норм па некаторых цэхах (кузьня, прамывачны). Адсюль недаацэнка тэхнічнага нармаваньня некаторымі адсталымі рабочымі, нахшталт Пішчалка, Міляшкевіч (паравозное дэпо) і інш., якія імкнуцца абыйсьці нармаваньне і аблайваюць нармоўшчыкаў.

Рэгуляваньне зарплаты ў новых калдагаварах павінна быць падпарадкавана задачам далейшага росту вытворчасьці, барацьбы з рэшткамі ўрэгулёўкі шляхам выдзяленьня ў аплаце працы вядучых прафэсій, а таксама рабочых на гарачых, дзяжкіх і шкодных для здароўя работах: (паравозны, кацельны, кавальскі цэхі і г. д.). Сама сыстэма зарплаты павінна быць пабудавана такім чынам, каб кожны рабочы быў зацікаўлен у пераходзе з пачасовай работы на зьдзельную.

Чыгуначныя прафарганізацыі павінны добра запамятаць, што нельга абмяжоўвацца падпісаньнем калдагавору, на гэтай справе не заканчваецца іх работа. У абавязак прафарганізацыі ўваходзіць таксама: давесьці новы калдагавор да кожнага рабочага, разгарнуць вакол яго масавую работу, забясьпечыць выкананьне рабочымі новых норм, зрабіць калдагавор моцнай зброяй у справе выкананьня пляна 1933 году.

Д. Х.

СПЛАУ ПАЧАУСЯ

НЯ ТРАЦЯЧЫ НІ ХВІЛІНЫ, ПА-УДАРНАМУ СКОЧВАЦЬ ЛЕС НА ВАДУ, ПОУНАСЬЦЮ СКАРЫСТАЦЬ ВЕСНАВОЕ РАЗВОДЗЬДЗЕ

Асноўную ўвагу—выплавачным рэчкам

Усьпех за лёдам на роках і рэчках пачынае плыты з лесам. Сёлетняя вясна апярэдзіла планы сплаўных арганізацый. У пойдзіўных раёнах БССР молены сплаў на невялікіх рэчках пачаўся 22-23 сакавіка. На сёньнішні дзень па ўсёй сыстэме Белсплаўканторы ўпушчана на ваду каля 200 тыс. кубэмэтраў драўніны. Мы стаім перад фактам пачатку сплаўной кампаніі. Яшчэ 2-3 дні і сплаўныя работы павінны разгарнуцца ў масавым маштабе.

Але ўся бяда ў тым, што Белсплаўканторы і яе нізавыя зьвенні не гатовы ў выстарчальнай ступені арганізаваць масавы сплаў. Раньняя вясна іх заспала, як кажуць, зьняпадку. Асабліва мощна гэе сабе адчуваць недахват рабочай сілы. Лес, падвезены да прыстаняй, ляжыць не абсартаваны і ня зьвязаны. На прыстані Сьвержань ляжыць каля 200 тыс. кубэмэтраў лесу. Для таго, каб яго зьвязаць і пусьціць у сплаў, патрэбна 200 плытагонаў. Але на сёньняшні дзень ні аднаго рабочага няма.

Дасягнічка гэтай прыстані Карасіка такое становішча ня турбуе. Ён зусім не займоецца адпраўкай плытагонаў, а такае пакуль яны прыйдуць да яго самі. Калі тав. Карасіку ўказалі на яго бязьдзейнасьць, дык ён асказаў: «У мяне няма сакратара, які-б езьдзіў і заключаў з калгасамі дагавары».

Больш таго, Карасік аптуе сущрэць адзіных наркамлясгасаўскіх расцэнак на сплаўныя работы. Па яго думцы, расцэнкі вельмі нізкія, а таму ён прапануе іх павысіць або ўвесьці на сплаўныя работы працоўную павінасьць. Ці можа такі «работнік» забясьпечыць выкананьне сплаўпагонаў? Прыдзецца проста зьвяльняць таму яго пагтуль ня сплавяй з пасады дасбаўнка.

Марозаў, Міхуноў.

Асноўную ўвагу—выплавачным рэчкам

Усьпех за лёдам на роках і рэчках пачынае плыты з лесам. Сёлетняя вясна апярэдзіла планы сплаўных арганізацый. У пойдзіўных раёнах БССР молены сплаў на невялікіх рэчках пачаўся 22-23 сакавіка. На сёньнішні дзень па ўсёй сыстэме Белсплаўканторы ўпушчана на ваду каля 200 тыс. кубэмэтраў драўніны. Мы стаім перад фактам пачатку сплаўной кампаніі. Яшчэ 2-3 дні і сплаўныя работы павінны разгарнуцца ў масавым маштабе.

Але ўся бяда ў тым, што Белсплаўканторы і яе нізавыя зьвенні не гатовы ў выстарчальнай ступені арганізаваць масавы сплаў. Раньняя вясна іх заспала, як кажуць, зьняпадку. Асабліва мощна гэе сабе адчуваць недахват рабочай сілы. Лес, падвезены да прыстаняй, ляжыць не абсартаваны і ня зьвязаны. На прыстані Сьвержань ляжыць каля 200 тыс. кубэмэтраў лесу. Для таго, каб яго зьвязаць і пусьціць у сплаў, патрэбна 200 плытагонаў. Але на сёньняшні дзень ні аднаго рабочага няма.

Дасягнічка гэтай прыстані Карасіка такое становішча ня турбуе. Ён зусім не займоецца адпраўкай плытагонаў, а такае пакуль яны прыйдуць

На прыстані Сьвержань—ніводнага плытагона

Рэчкі ўжо паўна ачысьціліся ад лёду, а Рагачоўскі сплаўвучасток сплаўных работ яшчэ не распачаў і калі распачне невядома. Асноўным тормазам зьяўляецца адсутнасьць рабочай сілы. Лес, падвезены да прыстаняй, ляжыць не абсартаваны і ня зьвязаны. На прыстані Сьвержань ляжыць каля 200 тыс. кубэмэтраў лесу. Для таго, каб яго зьвязаць і пусьціць у сплаў, патрэбна 200 плытагонаў. Але на сёньняшні дзень ні аднаго рабочага няма.

Дасягнічка гэтай прыстані Карасіка такое становішча ня турбуе. Ён зусім не займоецца адпраўкай плытагонаў, а такае пакуль яны прыйдуць

ВЫПРАВІЦЬ ПАМЫЛКІ

Толькі зараз, калі рэчкі ачысьціліся ад лёду і сплаў фактычна ўжо пачаўся, Белсплаўкантора ўсхапянулася і ўбачыла, што Лесбел яе падвёў, нарабіў галавацяпства. У чым яно заключаецца? Справа ў тым, што ў часе зімовай лесазьвязкі загатоўленая драўніна дастаўлялася ня толькі да прыставай вялікіх рок, дзе сплаў можна рабіць на працягу амаль цэлага лета. Значная колькасьць лесаматар'ялу (каля 30 проц. сплаўной праграмы) падвезена да берагоў малых рэчак і канавак, з тэй мэтай, каб скарыстаць весьнавое разводзьдзе і выплавіць лес на магістральныя рэкі.

Хто можа сутвярочыць такому мерапрыемству? Кашпоўнасьць яго відавочна. Пры правільнай арганізацыі сплаву яно можа даць значную эканомію і вызваліць сабекошт лясной прадукцыі. Але ўся бяда ў тым, што гэта самае капітоўнае мерапрыемства, праведзенае рукамі галавацяпаў з Лесбелу і многіх лесапрамгасаў, дало якраз адваротныя вынікі. Людзі аказаліся настолькі тупаўмуннымі, што забылі самае асноўнае. Яно заключаецца ў тым, што не па ўсякай рэчцы можна сплаўляць, а там, дзе сплаў і магчым, трэба ведаць, колькі можна сплавіць. Гэта ільціна кіраўнікамі многіх лесапрамгасаў (Мазырскага, Барысаўскага, Крупскага, Бягомльскага і інш.) і самага Лесбелу аказалася забытай. Забылі яны і тое, што сёлетняе весьнавое разводзьдзе, у сувязі з малой колькасьцю сьнежных ападкаў, будзе невялікае і вада хутка спадзе.

Лес пачалі вазіць куды ўздумалася і колькі ўздумалася. У выніку да некаторых рэчак падвезена столькі, што яго ня сплавіш на працягу ўсяго лета. Узяць хаця-б Мазырскі лесапрамгас. Там да невялікіх канавак (Ненач, Мухаедава, Славінічы, Глушкавічы, Трэмля і інш.) падвезена драўніны ў 2-3 разы больш, чым па іх можна сплавіць. Больш таго, лес вазілі проста да ручоў, дзе аб сплаве ня можа быць ніякай гутаркі. Не адсталі ад Мазырскага лесапрамгасу Барысаўскі, Бягомльскі і Крупскі.

Такая сутнасьць галавацяпства кіраўнікоў Лесбелу і некаторых лесапрамгасаў. Але ці можна зьнімаць віну з кіраўнікоў Белсплаўканторы? Ні ў якім разе! Яны добра ведалі, што лес прыдзецца сплаўляць ім, а таму трэба было загадзя ўказаць пункты, куды яго вазіць і ў якой колькасьці. Гэтага якраз зроблена ня было. А калі дзе і ўказалі месца, то кантролю над лесапрамгасамі не ўстанавілі і апошнія вазілі лес куды ім уздумалася. Адным словам, адны галавацяпілі, а другія сваёй пасьўпасьцю ім дапамагалі. І не заўважалі, што яны разам па сутнасьці фабілі шкодную работу, якая значна ўскладніць дастаўку драўніны да месца прызначэньня, павысіць сабекошт прадукцыі.

Ці можна зараз што-небудзь прадпрыняць, каб хаця частцова выправіць дапушчанае галавацяпства? Базумоўна можна. Трэба толькі неадкладна ўзяцца за гэту справу. Што канкрэтна трэба зрабіць? Перш за ўсё пабудаваць на рэчках часовыя плаціны, якія-б затрымлівалі ваду і ўзьнімалі яе ўзровень. Гэта дасьць магчымасьць свабодна праходзіць зьвязкам бярвеньняў. Гэта работа можа даць станоўчыя рэзультаты толькі ў тым выпадку, калі яна будзе праведзена зараз-жа. Тут рашаюць справу літаральна дні. На некаторых рэчках такая работа ўжо пачалася, яе трэба разгарнуць на ўсіх мясцох, дзе адчуваецца патр

ПЯЦІДЗЕНЬНІК ПРАВЕРКІ ПАДРЫХТОЎКІ ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРАК ДА СЯЎБЫ

Уздым ураджайнасьці калгасных палёў і гародаў— важнейшая ўмова паляпшэньня рабочага снабжэньня

ШТО ПАКАЗАЎ ПРОБНЫ ВЫЕЗД

ГОМЕЛЬ. Пробны выезд у поле ў прыгараднай гаспадарцы **Гомсельмашу** паказаў непадрыхтаванасьць калгасу да сяўбы.

Брыгадзір садовай брыгады **Парачкін** на нарадзе аб выніках пробнага выезду проста заявіў, што яго брыгада да выхаду не гатова. Гэта заява пацьвярджаецца рядам фактаў. Замест 8 коняй, якія павінны былі выйсьці з апырскавальнікамі, культыватарамі і плугамі, выйшлі толькі 6. Вывезеныя апырскавальнікі аказаліся непрыгоднымі для работы. Што павінна рабіць брыгада, якія нормы выпрацоўкі даны кожнаму рабочаму — ні брыгадзір, ні яго рабочыя ня ведаюць.

Брыгадзір нават ня ведае, якія коні замацаваны за яго брыгадай, бо прымацаваньне праведзена фармальна.

Па палявой брыгадзе, якой кіруе тав. **Зубранаў**, замест 29 коняй на пробны выезд выйшла толькі 22. Усе коні былі запрэжаны без сядзёлак. Нестромкі зроблены вельмі дрэнна. Замест 60 рабочых на працу выйшла толькі 19.

У палявой брыгадзе павінна працаваць 9 плугоў, выйшла ў поле толькі 6. Замест 4 борон было 3, фуражнак патрэбна 12, былі толькі 2. Інвэнтар, такім чынам, не падрыхтован да сяўбы.

Трактар гаспадаркі на прымаў удзелу ў пробным выезьдзе. Загадчык гаспадаркі Рыўкін на запытаньне, чаму ня выпнаў трактар, адказаў: «Мы яму не дазволілі». Аднак, на справе аказалася, што трактар не падрыхтаваны, у ім пагаслася каробка хуткасьцяй.

Не паказала прыкладу і гародняя брыгада. Яна выйшла на пробны выезд без ручных сявалак. Брыгадзір **Галюфін** каска, што сявалкі яшчэ рамантуюцца на заводзе.

Асабліва дрэннае ўражаньне зрабілі коні. Догляд цягавай сілы вельмі дрэнны. У пяці коняй зьбітыя плечы і сьпіны, а ад работы яны ня вызвалены, у сувязі з чым раны не загойваюць.

Адміністрацыя гаспадаркі на чале з дырэктарам **Белазерскім** інструкцыі ад неслася да выезду. Яна насьпех скамплектавала брыгады, «укамплектавала» іх людзьмі, якія ня ведаюць сваёй справы.

Працэгаўнікі адміністрацыі, партыкому і заўкому Гомсельмашу, якія былі на пробным выезьдзе, не пацікавіліся, у якіх бытавых умовах жывуць рабочыя гаспадаркі, як арганізавана грамадзкае харчаваньне, дзе будуць зьмешчаны тыя 80 рабочых, якія патрэбны гаспадарцы.

Пробны выезд калгасу Гомсельмаш паказаў, як вельмі рыхтаваецца да выхаду ў поле.

М.

Цягавая сіла патрабуе рамонту

МАГІЛЕЎ.

Прыгарадная гаспадарка Магілеўскага ТСТ не гатова да сяўбы. З патрэбных 625 парніковых рам закладзена толькі 200. Гаспадарцы патрэбна 120 пастаянных рабочых, ёсьць 90. Зусім дрэнна ідзе вывазка гною — трэба вывезьці 4.384 тоны, вывезена 1.200. Не ўстаноўлены нават нормы вывазкі для рабочых. Да гэтага часу не скарыстаны пляцформы гаспадарчага парку станцыі, ня гледзячы на тое, што ёсьць згода адміністрацыі парку.

Процантаў 35 коняй трэба паставіць на папраўку, але кіраўнікі гаспадаркі спадзяюцца, што «коні выцягнуць».

Коні стаяць у брудзе, ня чысьцяцца. Лясьні па сьпіне — пыл хмарай. Фураж расходуецца бяз усякага ўліку, што пагражае нястачай яго ў самы гарачы час сяўбы. Цягавая сіла забясьпечана толькі фуражом, аб загатоўцы канцэнтраваных кармоў ніхто не клапоціцца.

Шын.

Кіраўніцтва Бабруйскага камбінату ігнаруе патрэбы калгасу

БАБРУЙСК. Калгас Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату яшчэ не гатоў да сяўбы. Гною вывезена каля 5 тыс. тон пры заданьні ў 8 тыс. Ня выкананы таксама план вывазкі попелу.

Коні калгасу бяз усякага догляду. З 49 коняй годны для работы толькі 6. Канцэнтраваных кармоў для падтрыманьня конскага паголоўя не хапае.

Дрэнна стаіць справа з вярбоўкай рабочай сілы. Замест 120 рабочых ёсьць толькі 32. Аддзел эканомікі працы камбінату палец аб палец ня стукнуў, каб забясьпечыць калгас рабочай сілай. Загадчык аддзелу **Кендыш** займаецца апартуністычнымі, хвасьцісцкімі размовамі, спасылаючыся на малыя нормы хлеба, як на прычыну трэннага забясьпечэньня калгасу рабочай сілай.

Наогул, гаспадарка не падрыхтавалася да прыёму новых рабочых: інтэрнаты не абсталяваны, сталоўка яшчэ не адрэмонтавана.

Калгас мае два трактары. Адзін з іх дагэтуль нават не сабраны. Пра другі трактарыст **Ісаенка** ўвесь час сьцьвярджаў, што машына зусім спраўная. Першая-ж праверка паказала, што Ісаенка проста займаўся ашуканствам, не агледзеў нават трактара. Пробная праверка паказала, што машына патрабуе паўтэрнага рамонту.

Для сяўбы не хапае каля 40 тон бульбы, а таксама цыбулі і часнаку. Пробная праверка капцоў выявіла значную колькасьць гнілой бульбы. Аднак, адміністрацыя нічога не зрабіла, каб перавесьці бульбу ў гароднікавальню і адсартаваць добрую.

Брыгады фармальна створаны, але ні адна з іх поўнасьцю не ўкамплектавана. Аб узядзеньні зьдзельшчыны і гаварыць нят прыходзіцца, паколькі няма яшчэ расцэнак.

Калгас апстае галоўным чынам таму, што дырэкцыя камбінату зусім ня цікавіцца яго работай, яна забывае аб тым, што калгас зьяўляецца адным з цэхаў прадпрыемства. Варта прывесьці толькі адзін факт: вучастак у 3 га зямлі, падрыхтаваны для пасеву буракоў, запят дырэкцыяй для складаньня дэпэш.

Прафсаюзная арганізацыя камбінату не забясьпечыла штодзённай дапамогі прыгараднай гаспадарцы. На шперы цэхі прымацаваны да пасобных вучасткаў калгасу, а на справе нічога ня зроблена.

У той час, як арганізацыі камбінату мелі поўную магчымасьць дапамагчы вывазцы гною на палі калгасу, яны не аддалі ўвагі гэтаму пытаньню і вывазка арыўаецца.

Шматтыражка камбінату «За ўдарныя тэмпы» не мабілізавала рабочых фабрыкі на дапамогу калгасу. За сакавік яна дала толькі адну падборку аб становішчы ў прыгараднай гаспадарцы. Вывады з усяго вышэй сказанага арыгінальныя.

Арк.

Агранамічныя „рэцэпты“ Выніцкага

БАРЫСАЎ. «Зьвязда» ўжо паведамляла аб дрэнным становішчы з падрыхтоўкай да сяўбы на прыгараднай гаспадарцы камбінату «Камінтэрн». Малюнак за апошні час мала зьмяніўся. Замест 1.765 тон гною вывезена 583, або 32 проц. Пры такіх тэмпах прыдзецца вазіць гной яшчэ, мінімум, 40 дзён.

Цягавая сіла ў выніку дрэннага догляду знаходзіцца ў такім стане, што коні, замест 3-4 рэйсаў, штодзень на робяць, самае большае, два. У той-жа час, мабілізаваны гарсаветам транспарт скарыстоўваецца надзвычай дрэнна. Замест плянавых 4-х рэйсаў, коні робяць адзін. Грузавік два дні стаяў без работы і ніхто не падумаў аб тым, каб скарыстаць яго для вывазкі гною.

Дырэктар фэрмы тав. **Вільсдорф** вельмі спакойны. Ён глядзіць на ўсё скрозь ружовыя акуляры: «Фэрма масьнее з падрыхтоўкай да сяўбы— час яшчэ ёсьць. А пакуль, бачыце, няма людзей, няма коняй, былі-б людзі, былі-б коні, гной вывезьлі-б».

Ніколькі не адстае ад гэтага апартуніста і старшыня ЗРК **Выніцкі**. Ён даказвае ўсім і кожнаму, што можна сеяць бяз гною. Які ўраджай будзе пасьля рэалізацыі яго «рэцэпту», Выніцкага мала цікавіць. Яго зусім не турбуюць інтарэсы паляпшэньня рабочага снабжэньня.

Нядаўна была праведзена праверка падрыхтаванасьці да выхаду ў поле саўгасу **«Глівіна»**. Выезд паказаў, што саўгас не падрыхтаваны да веснавой сяўбы. Інвэнтар і цягавая сіла не замацаваны за брыгадамі і рабочымі. Збруя да коняй не падагнана, не змазана, шмат збруі парвана.

Выехаўшая ў поле паляводчая брыгада забыла ўзяць з сабой увесь інвэнтар, прыйшлося рабочым варочацца назад за ім.

Вярнуўшыся з поля, рабочыя параскідалі па дварох увесь інвэнтар.

Догляд жывой цягавай сілы вельмі дрэнны. Кармавыя фонды разбазарваюцца,—кармы выдаюцца конюхам без усякага ўліку.

Ударныя тэмпы падрыхтоўкі паказалі рабочыя П. Вярбіцкі і С. Нядбашы, якія праз 7 мінут пасьля гудка былі гатовы да выезду.

К. Н.

Дзе фінансавая дысцыпліна і кіраўніцтва вясковымі кіно-перасоўкамі?

(Ліст у рэдакцыю)

У канцы 1931 году ў БССР працавала ўсяго 150 кіно-перасовак. Цяпер іх 385.

Аднак, гэта лічба зісім не гаворыць за якасьць кіно-абслугоўваньня вёскі. Адсутнасьць усякага кіраўніцтва вясковай кіно-сеткай з боку Белдзяржкіно не магла не адбіцца на якасьці працы кіно-перасовак, на выкананьні імі прамфінпляну.

За 1932 год чысты дэфіцыт па кіно-перасоўках Менскага аддзяленьня склаў 66.122 р., Гомельскага — 80.116 руб., Бабруйскага—69.629 руб., Аршанскага—42.763 руб., Віцебскага—61.350 руб., што складае за год па ўсіх аддзяленьнях Белдзяржкіно **319.890 руб.**

Гэта вынік незамацаванага росту, вынік абязьлічкі ў справе кіраўніцтва кіно-перасоўкамі.

«Надвор'е» першага кварталу 1933 году не паказвае на лепшае, бо, як паказваюць вынікі праверкі работы Гомельскага аддзяленьня, ні само аддзяленьне, ні райупаўнаважаныя Белдзяржкіно не займаюцца зусім вясковай кіно-сеткай.

Куды-ж дзяюцца сродкі? Дзе фінансавая дысцыпліна? Дзе кіраўніцтва самога Белдзяржкіно вясковай сеткай кіно-перасовак? Гэтага ў кіраўніцтва няма. Патрэбна ўмяшаньне ЦКК-РСІ

Гурбо.

Сіроцінскі РВК ня кіруе нацыянальным польскім сельсаветам

Шматлікія прыгожыя рашэньні сіроцінскіх раённых арганізацый аб разгортваньні культурна-асьветнай работы ў новаарганізаваным польскім Баранькаўскім сельсавеце да гэтага часу ў жыцьцё не праведзены. Баранькаўскі сельсавет лічыцца польскім, а ўся праца праводзіцца выключна на беларускай мове. Гурток па аўладаньні польскай мовай за чатыры месяцы не працаваў і нават ні разу не зьбіраўся. Ня гледзячы на тое, што аб гэтым пісала раённая газэта. Усе лікпункты, якія павінны працаваць на польскай мове, працуюць на беларускай, бо няма ніводнага падручніка на польскай мове. Нават у польскай ШКМ няма падручнікаў і там працуюць на беларускай мове.

Пацкамісія пры РВК нічога ня робіць. Райана таксама не клапоціцца аб падручніках і настаўніцкіх кадрах для польскіх школ. Аб прасоўваньні газэты «Орка» у масы ніхто ня думае. На ўвесь сельсавет, які налічвае да 40 насельніцкіх пунктаў, выпісваецца толькі 3 экз. «Оркі»: Нават пасобныя настаўнікі, як Вензыкставіч, ня выпісваюць гэтай газэты. Бязьдзейнасьцю гэтай карыстаецца клясавы вораг і праводзіць сваю шкодную работу.

Райком партыі і РВК павінны ўзмацніць барацьбу за правядзеньне ў жыцьцё ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Сіроцінскі.

Выгнаць кулацкага агента Камушкава з калгасу

(Ліст у рэдакцыю)

У калгасе «Чырвоны пуцілавец», Дубровенскага раёну, пралезла група шкоднікаў—Зубаў, Шалатокін, Клименкоў і інш. Фактычна кіраўніцтва знаходзіцца ў руках гэтай групы, бо Камушкаў (старшыня калгасу) свой чалавек. Камушкаў у 1919 годзе дэзартаваў з Чырвонай арміі, будучы членам сельскага прыгаў удзел у грабяжы каапэрацыі ў часе пажару, і выдаваў заможнікам фіктыўныя дакументы на памол збожжа і г. д.

Пераход на пасаду старшыні калгасу і сельсавету адначасова адкрыў для яго шырокае поле дзейнасьці. Ён рабіў усё, каб сарваць розныя віды за гатовак. Выключна па віне Камушкава загінула 4 га капюшыны, і ля 300 пудоў бульбы. Па яго загаду сьвіньням давалі ваду з тухлай студні. Ад гэтага загінула 12 штук сьвіней. Раскрадваньне ільну, і вогул грамадзкай маемасьці, звычайная справа.

Аб гэтых злачынствах ведаюць раённыя арганізацыі. Матар'ялы, якія пакіроўвае раённая газэта, або «Зьвязда» на расьсьледаваньне вандруюць з міліцыі ў пракуратуру, а адтуль у РКС, райкалгассаюз да таго часу, пакуль хто небудзь не пакладзе пад сукно.

Тав. Скраба, які вызначан для праверкі калгасу «Чырвоны пуцілавец» сабраў даволі шмат фактаў злачыннай дзейнасьці кулацкай групы, але, абмежаваўся толькі напісаньнем выва даў, дзе патрабаваў выключэньня з калгасу Камушкава і Зубава. Аднак, гэтага мерапрыемства ён нават і ня думаў праводзіць у жыцьцё. Больш таго, ён нават стварыў тэорыю, каб апраўдаць прабываньне кулацкіх элементаў у калгасах. Скраба лічыць, што выкідваць кулакоў з калгасу зараз ня трэба, бо «ў другой пяцігодцы канчаецца калектывізацыя і іх ўсяроўна прыдзецца ўзяць у калгас».

Хто, як не кулацкі агент, гаворыць вуснамі Скраба. Пакінуць кулакоў у калгасе—гэта азначае даць ім магчымасьць разбураць калгас з сярэдзіны. Дубровенская партарганізацыя павінна рашуча змагацца з такімі разважаньнямі і з коранем выкарчаваць падобную «тэорыю» і практыку.

О. К.

Ад рэдакцыі: «Зьвязда» чакае хуткага рэагаваньня Дубровенскай РКК-РСІ.

З ЛІСТОЎ РАБОЧЫХ І КАЛГАСЬНІКАЎ

Мы, інваліды г. Менску, зьвяртаемся да газэты «Зьвязда» з просьбай дапамагчы нам зьніпчыць непаладкі ў рабоце нашай касы. Для таго, каб атрымаць пэнсію, трэба прыходзіць некалькі разоў. Часта пэнсію затрымліваюць на 3 і больш месяцаў. А бывае і так, што гублялюцца дакументы і тады сусім нельга атрымаць грошай.

РАБІНОВІЧ, ГЭЛЬЦАР, ЛОЙКА.

***

Для таго, каб атрымаць гаручае (нафту, газу, бензыну) на Менскім нафтаскладзе, трэба пяць разоў стаяць у чадзе. Загадчык складу, ён-жа і вагаўшчык, дасьпіць мінут трацінь на накладаньне рэзалюцыі і 1—1½ гадзіны на выдачу гаручага з рэзервуару. Касір таксама працуе марудна мі тэмпамі. У яго на разьлік з адным кліентам ідзе паўгадзіны часу.

Посьпех пасеўнай кампаніі ў значнай ступені будзе залежыць ад добрага забясьпячэньня трактараў гаручым. Таму нафтаскладу неабходна перабудаваць сваю працу.

ШОФЭР.

Разбуральнікаў нацыянальнай школы —да суровай адказнасьці!

Пастановы ЦК УсеКП(б) і IV пленуму ЦК КП(б)Б далі ясную ўстаноўку партыйным, савецкім і прафсаюзным арганізацыям аб паляпшэньні работы школ і матар'яльна-бытавога становішча настаўніка. Але гэтыя гістарычныя пастановы ў Лёзьнянскім раёне яўна ігнаруюцца.

Кіраўнікі райкому і аддзелу Нарасьветы зусім ня цікавяцца, у якіх умовах працуюць школы і настаўнікі. З 1930 г. у Вунаўскім латыскім нацыянальным сельсавеце працуе латыская ШКМ імя Р. Эйдзмана, якая зьяўляецца адзінай ва ўсёй БССР. Здавалася-б, што гэтай школе трэба было аддаць максымум увагі як у сэнсе матэрыяльнай, так і матар'яльнай дапамогі, паставіць яе на роўных правах з іншымі школамі нацменшасьцяй БССР.

Але ў раёне ёсьць зусім адваротны погляд на гэту школу. Калі вучні больш-менш забясьпечаны здавальняюча, то настаўнікі — зусім дрэнна. У 1932 г. настаўнікі латыскай ШКМ не прымацоўваліся ні да аднаго калгасу. Настаўнік Граус цэлы год жыў проста галадаючы і ніхто яго становішча не заўважаў. Толькі тады раённыя ўстановы Нарасьветы ўзварушыліся, калі тав. Граус падаў заяву, што працаваць больш ня будзе.

У 1933 г. справа ня лепшая. Спачатку году ніхто, як кіраўніку латыскай ШКМ, прышлося напісаць ліст у ЦКК-НК РСІ БССР аб матар'яльным становішчы настаўнікаў школы і аб агідных адносінах да іх з боку мясцовых кіруючых арганізацый. НК РСІ патрабаваў тэрміновага прыцягненьня вінаватых да адказнасьці. Райана і райкалгассаюз фармальна выканалі дадзеную ім прапанову. Зараз настаўнікі латыскай ШКМ прымацаваны да калгасу «Бязбожнік», але нічога адтуль не атрымліваюць. Ужо два месяцы, як яны не атрымліваюць мукі таму, што старшыня калгасу «Бязбожнік» ПУКАЎ распарадзіўся выдаць настаўнікам муку нізкай якасьці, ад якой, базумоўна, настаўнікі адмовіліся.

Згодна адносіны РКС калгас павінен быў выдаваць настаўнікам і тлушчавыя прадукты. Настаўнікі гэтых прадуктаў не атрымліваюць. Больш таго, ім урэзалі малако: замест 1 літра выдаюць ½ літра. У лютым на агульным сходзе калгасьнікаў пры разьмеркаваньні даходаў настаўнікам быў складзен фонд у 92 пуды жыта. На другі дзень старшыня Пукаў заяўляе: «Ваш настаўніцкі фонд скарыстан для калгасьнікаў, таму атрымліваць хлеба ня прыдзецца». Такім чынам, настаўнікі латыскай ШКМ вымушаны купляць хлеб на рынку.

Зараз настаўнікі замест скарыстаньня каштоўнага часу на грамадзкую працу па падрыхтоўцы да сяўбы, павінны хадзіць, шукаць харчаваньня.

Як адносяцца да ігнараваньня настаўнікаў раённыя кіраўнікі? Тав. Пятроўскі (нарсудзьдзя) у лютым канонт забясьпячэньня настаўнікаў сказаў на ступнае: «Калі мы працуем, дык і атрымліваем з закрытага разьмеркавальніка розныя прадукты, а настаўнікам не даюць таму, што яны нічога ня робяць».

5-га сакавіка на пленуме Унаўскага сельсавету, на якім прысутнічала 80 чалавек, прадстаўнік РВК т. Дзямідаў назваў маладога настаўніка Целяпнева «шчаняком» (?!). А гэты настаўнік, між іншым, акрамя сваёй школьнай работы, вядзе вялікую работу па падрыхтоўцы да сяўбы ў калгасе «Рэкорд».

Ці такія павінны быць адносіны да настаўніка?

У цяжкіх умовах расла і разьвівалася латыская ШКМ, а калі зараз сваімі ўласнымі сіламі пабудавалі габінэты і інтэрнаты, дык старшыня калгасу «Бязбожнік» Пукаў 18 сакавіка г. г. заяўляе: «Трэба к чорту разагнаць латыскую школу, бо яна пасьцягвала ўсе лепшыя будынкі».

Які-ж далі адпор гэтаму шавіністу Пукаву работнікі сельсавету? Сакратар сельсавету т. Аўстрын супакойвае: «Не палохайцеся, ня выкінуць, ці варта прымаць сур'ёзна пагрозы?» Гэты замах Пукава ня першы. У 1929 г. ён быў асуджан на 8 месяцаў пазбаўленьня волі за антысэмітызм, зараз ён кіруе калгасам, дзе ёсьць пераплёт трох нацыянальнасьцяй.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб яўным ігнараваньні ў Лёзьнянскім раёне пастаноў ЦК нашай партыі пра школу. Вінаватых неабходна прыцягнуць да суровай адказнасьці.

ВЭЙСС ЮРКА ЯНКАЎ.

НА ПОВАДУ Ў КУЛАКОЎ

(Ліст селькора)

Па цэлым радзе калгасаў Пашкоўскага сельсавету, Магілеўскага раёну, за апошні час раённая газэта «Камунар Магілеўшчыны» выкрыла злоўжываньні і разбазарваньне калгаснай маемасьці. Так, напрыклад, у калгасе імя Будзённага праўленьне калгасу разбазарыла шмат збожжа. Не засталося нават насеннага і страхавога фондаў. Тры га ільну зусім прапала. У калгасе імя Варашылава праўленьне разам з кладаўшчыком загнала 21,5 цэнтн. збожжа. Наглядаецца раз базарваньне прадуктаў. Гэта вынік таго, што ўлік у калгасе пастаўлен дрэнна. У калгасе «Першае мая» панае безгаспадарчасьць. Бескантрольна здаецца кладаўшчыку воўна, гародніна і інш. прадукты, а гэта дае магчымасьць раскрадваць. Падобнае можна бачыць і ў калгасе імя Леніна.

Чаму маюць месца такія факты? Таму, што гэтыя калгасы засьмечаны варожымі элементамі. У калгасе імя Будзённага праўленьне складзецца з кулакоў—ашуканцаў, якія ўвесь час прапіваюць калгасную маемасьць. Праўленьне калгасу імя Варашылава і кладаўшчык—адна цёплая сямейка. Старшыня гэтага калгасу Куляшоў—былы цьвёрдазаданьнік.

У калгасе «Першае мая» сапраўдны сямейны букет. У праўленьні рахункавод—дзядзька, старшыня—пляменьнік і кладаўшчык—двюрадны брат. Гэта тройка заварачвае ўсімі справамі калгасу. Ім дапамагаюць тры чатыры сям'і заможнікаў, якія лічацца калгасьнікамі, а сапраўдныя калгасьнікі ні аб чым ня ведаюць. Тут поўны заціск крытыкі і самакрытыкі.

Пра гэта добра ведае старшыня сельсавету, ён-жа і сакратар камсамольскай ячэйкі Камкоў, але маўчыць. Ён не жадае парушыць добрых адносін з праўленьнямі калгасу, бо яны яму выгадныя.

РВК не рэагуе на зьмешчаныя ў газэце допісы. Тав. Сарокін (прадстаўнік РВК) праводзіў у калгасе імя Варашылава сход, але ніякіх практычных мер ня прыняў.

Майскі.

Ад рэдакцыі: «Зьвязда» чакае ад магілеўскай РКК-РСІ хуткага рэагаваньня па гэтаму допісу.

Зрабіць тавараснабжэньне моцнай зброяй барацьбы за бальшавіцкае правядзеньне сяўбы

Ці павярнулася сыстэма спажывецкай каапэрацыі БССР тварам да калгаснай вытворчасьці, ці ўлічваюцца яю асаблівасьці таго ці іншага раёну, сельсавету, калгасу, чым і як яна стымулюе баявую падрыхтоўку да сяўбы і ўплывае на адстаючых?

На гэтыя важнейшыя пытаньні заклікана была даць выразны адказ усебеларуская нарада старшынь райспажыўсаюзаў, якая гэтымі днямі адбылася ў Менску. Прадстаўнікі з месц патаўнны былі падзяліцца вопытам перабудовы сыстэмы спажывецкай каапэрацыі ў вёсцы, у адпаведнасьці з дырэктывамі партыі і апошняга пленуму Цэнтрасаюзу. Гэтыя дырэктывы прапанавалі так перабудаваць усю работу каапэрацыі, каб пастаўіць тавараснабжэньне ў непасрэдную залежнасьць ад выкананьня тым ці іншым раёнам, сельсаветам, калгасам і вёскай сваіх вытворчых заданьняў. Тавараснабжэньне павінна было быць пастаўлена на службу падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і пасьпяховаму правядзеньню самой пасеўнай кампаніі.

Выступаючы на нарадзе загадчык арганізацыйным сэктарам Белкаапсаюзу тав. Баксман заявіў, што прынцыпт дыферэнцыяванага снабжэньня ўзяты (у залежнасьці ад ходу падрыхтоўкі да сяўбы) на вазьмецы Белкаапсаюзам не ажыцьцяўляецца. Па думцы дырэктара гандлевага кіраўніцтва БКС т. Фалькова, немагчыма рэгуляваць завозу тавараў у раёны з тае прычыны, што... райсаюзы атрымліваюць тавары з баз транзітам. Зразумела, што ў такіх умовах немагчыма нібыта і манэўраваць перакідкай таварных мас з аднаго раёну ў другі.

Што-ж робіцца на месцах?

Ельскі раён, як вядома, першым распачаў звышрэкордную сяўбу. Зусім натуральна, што нарада чакала высьвятленьня практыкі работы райсаюзу і сельспажыўтаварыстваў па-новаму. Але старшыня Ельскага райсаюзу так і ня даў адказу на гэта важнейшае пытаньне. Уся яго прамова была прысьвечана арганізацыі дзіцячых ясьлей, як быццам іншыя задачы ў абслугоўваньні сяўбы перад імі не стаяць.

Ня мог падзяліцца вопытам ужываньня новых метадаў тавараснабжэньня і старшыня Чэрвеньскага райсаюзу тав. Ялоза. Прычына зразумела: яго сыстэма яшчэ не перабудавалася. Тавараснабжэньне ідзе па-старому. Чэрвеньскі райсаюз не забясьпечыў сыстэмы важнейшымі таварамі. Няма солі, газы, рыбнарных вырабаў. Затое райсаюз закупіў на 20.000 руб. замкоў з адным «універсальным» ключом... у Днепрапятроўску. Замарозіўшы такім чынам вялікую суму грошай, райсаюз ня можа хаваць закупіць-тавараў, якія сапраўды патрэбны для абслугоўваньня сяўбы.

Выпадковае прэміраваньне замест карэннай зьмены мэтадаў работы

Прыблізна ў такім-жа духу выказваліся старшыні Мсьціслаўскага, Бабруйскага і шмат іншых райсаюзаў. Выступленьні з месц сьведчылі аб тым, што большасьць райсаюзаў нават і не прыступіла да ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі аб перабудове мэтадаў тавараснабжэньня вёскі. Праўда, некаторыя райсаюзы зрабілі поўныя крокі ў гэтым напрамку, але, не ўявіўшы сабе добра ўсёй сутнасьці перабудовы, дапусьцілі рад скажэньняў. Рагачоўскі райсаюз, напрыклад, «прэміяваў» 12 калгасаў, якія добра падрыхтаваліся да сяўбы, дэфіцытнымі таварамі на 13.000 рублёў. Чаму іменна на 13.000 руб. — старшыня райсаюзу тав. Раеўскі адказаць ня мог.

У сьвятле сказанага ня дзіва, што ні адзін сельсавет, ні адзін калгас, які правальвае падрыхтоўку да сяўбы, не алчуў пагоршаньня тавараснабжэньня. Райсаюзы фактычна ня ўрэзваюць вамечанага плыну завозу тавараў у адстаючыя па падрыхтоўцы да сяўбы сельсаветы. У лепшым выпадку, гэта ўрэзваньне нязначнае і датычыць другарадных тавараў. Яно, зразумела, нішкага ўплыву на агульнае становішча са снабжэньнем дапага сельсавету ня робіць. Ня было такога выпадку, калі-б райсаюз зусім пазбавіў снабжэньня асноўнымі таварамі якое небудзь сельспажыўтаварыства за зрыў падрыхтоўкі да сяўбы, растлумачыўшы масам прычыны ўжываньня такога мерапрыемства.

Як вызьвілася на нарадзе, усё-ж ёсьць і райсаюзы праўляючыя актыўнасьць у перабудове. Вялікую дапамогу праўляе Слуцкі райсаюз, які імкнецца ўказань тавараснабжэньне вёскі з хопам падрыхтоўкі да сяўбы. Па сыстэме Слуцкага райсаюзу плян тавараабароту за першы квартал выкананя на 132 проц. Тавараснабжэньне праводзіцца на аснове штодзённага вывучаньня ходу падрыхтоўкі да сяўбы ў пэўным сельсавеце, калгасе. Гэтаму дапамагае цесная сувязь каапэратараў рабоў з райсаю, сельсаветам, а калгасам — самой масай. У Слуцкім раёне вялікую карысьць далі канкрэтныя дагаворы, якія заключалі сельспажыўтаварыствы з калгасамі і брыгадамі.

Адпаасобнік выпаў з пад увагі БКС

Аб значэньні сяўбы ў аднаасобным сэктары ня прыходзіцца гаварыць. Партыя за апошні час даволі катэгарычна паперэджвала аб недапушчальнасьці ігнараваньня гэтага пытаньня. Нарада паказала, аднак, што сыстэма спажывецкай каапэрацыі яшчэ ня ўлічыла папярэджваньняў партыі. За выключэньнем асобных прадстаўнікоў месц, выступаўшыя зусім ня лічылі патрэбным гаварыць аб тых канкрэтных мерапрыемствах, якія спажыўкаапэрацыя абавязана ажыцьцявіць, каб забясьпечыць выкананьне аднаасобнікам плану сяўбы і гадыму ўраджайнасьці. Белкаапсаюз ня даў сыстэме нізкіх канкрэтных указаньняў аб прынцыпах абслугоўваньня аднаасобнага сэктару. Гэтая недапушчана Белкаапсаюзам аднаасобнага сэктару, як паказала нарада, адбілася на рабоце ўсёй сыстэмы.

Толькі ў самы апошні час, пасьля пастановы ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і сьвятлай друку, Лагойскі і Слуцкі райсаюзы, не дачакаўшыся ўказаньняў Белкаапсаюзу, прынялі канкрэтную праграму. Асаблівай увагі заслугоўвае пачын Слуцкага райсаюзу. Акрамя разгортваньня арганізаванай работы на сельскіх зьлётах аднаасобнікаў, каапэрацыя Слуцчыны пачала ўжываць мэтады індывідуальнай апрацоўкі аднаасобніка. Сельспажыўтаварыствы праз каапупаўнаважаных заключаюць з групамі аднаасобнікаў і з асобнымі працоўнымі сялянамі спэцыяльныя абавязацельствы. З аднаго боку, аднаасобнік указвае, якія падрыхтоўчыя пасеўныя мерапрыемствы і ў які тэрмін ён абавязваецца іх выканаць, а з другога боку — каапупаўнаважаны ад імя сельспажыўтаварыства абавязваецца забясьпечыць аднаасобніка пэўнымі таварамі. Па Слуцкім сельсавеце ўжо заключана каля 100 узаемабавязацельстваў з аднаасобнікамі.

Разгарнуць грамадзкае харчаваньне

Нарада паказала, што ў галіне разгортваньня грамадзкага харчаваньня ў калгасах, спажывецкая сыстэма праўляе злачынную бязьдзейнасьць зьверху да нізу. Амаль кожны з выступаўшых пачынаў паведамленьнем, што плян арганізацыі сталовак «яшчэ ня выконваецца», спасылаючыся на дзесяткі прычын, нібыта ад райсаюзу незалежачых. «Райсаюзу не даюць вестак, дзе патрэбны сталоўкі», «калгасы яшчэ не далі адказаў аб жаданьні арганізаваць грамадзкае харчаваньне», «калгасы катэгарычна адмаўляюцца арганізаваць сталоўкі» — вось на што скаржыліся старшыні райсаюзаў.

Гэтыя заявы сьведчаць аб яўным нежаданьні райсаюзаў займацца арганізацыяй грамадзкага харчаваньня ў калгасах (справа клапатлівая і «нерэнтабельная»), аб іх злачынным ігнараваньні важнейшага мерапрыемства, якое заклікана забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне сяўбы. Вузка-дзяліцкі падыход сыстэмы да гэтага палітычнага мерапрыемства паслужыў прычынай таго, што рад каапэратараў не прымецілі шкоднікую дзейнасьць кулака на гэтым участку. Старшыні райсаюзаў тлумачылі нежаданьне калгасаў арганізаваць сталоўкі невялікім разьмерам калгасаў: «кожны калгасьнік, можа абедаць дома—хата недалёка». Каапэратары забылі, што рашаючае значэньне ў пасеўнай кампаніі заклікана адыграць і калгасьніца, а паколькі яна будзе занята прыгатаваньнем справы, актыўны ўдзел яе ў палявых работах ня можа быць забясьпечан.

Гэту ісьціну добра зразумеў кулак, які арганізаваў сабатаж грамадзкага харчаваньня ў калгасах БССР. Скарыстаўшы грубую палітычную недагляднку пытаньня, у першую чаргу з боку каапэратараў, і клясавую сьляпату некаторых мясцовых арганізацый, кулак сарваў падрыхтоўку да арганізацыі калгасных сталовак. Аб наяўнасьці кулацкага сабатажу яркa сьведчыць раскас т. Рубена,—старшыні Капыльскага райсаюзу, які даў выразную палітычную характарыстыку становішча. Калі райсаюз глыбей зацікавіўся пытаньнем, дык выявіў, што справа не ў «нежаданьні» калгасу арганізаваць сталоўку, а ў падрыўной дзейнасьці кулакоў і падкулачнікаў, якія залезьлі ў калгас. «На што вам выкладаць ля бедняцкага сала і хлеб на грамадзкае харчаваньне, калі вы можаце абедаць дома» — так агітаваў калгасьнікоў клясавы вораг. Варта было вылучыць выкрытых кулакоў з калгасу імя Молатава, каб там на працягу некалькіх дзён арганізавалася сталоўка.

На нарадзе вельмі яркa адлюстраваліся нікчэмныя мэтады кіраўніцтва і працы, якія яшчэ, як відаць, ужываюцца большасьцю адказных каапэрацыйных работнікаў. Гадзінныя прамовы, траскучыя фразы, дэкляцыі і папяровыя дырэктывы усё яшчэ пад мяняюць бальшавіцкую дзейсьнасьць, апэратыўнасьць і гібкасьць, г. зн. умовы, якія вырашаюць посьпех перабудовы сыстэмы.

Падхапіць выклік Мачахскага ССТ

Сакратар ЦК КП(б)Б тав. Рыскін, які ў канцы нарады выступіў з вялікай прамовай, спыніўшыся на падрыхтоўцы да весны, заўважыў, што да гэтага часу нічога практычнага ня зроблена, каб пашырыць па БССР каштоўны вопыт перабудовы работы Мачахскага сельспажыўтаварыства (УССР).

Тав. Рыскін завастрыў увагу на неабходнасьці практычна адгукнуцца на заклік Мачахскага сельспажыўтаварыства і па справе разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва ў сыстэме спажыўкаапэрацыі БССР, на лепшае абслугоўваньне сяўбы, на хутчэйшую перабудову ўсёй работы каапэрацыі і ў першую чаргу мэтадаў тавараснабжэньня вёскі. Сакратар ЦК КП(б)Б рашуча паставіў пытаньне перад сыстэмай аб необходнасьці, урэшце, пакончыць са старымі мэтадамі работы, выкарэньваць расхлябанасьць, недысцыплінаванасьць і бесгаспадарчасьць, вучыцца ў каапэратыўных радоў эканоміці, жыцьцёў, кулакоў і перакладчыкаў, якія нагольны жэрмань і шкодзяць так, як гэтага патрабуе партыя.

Ц. П.

У лябірынце эўрапейскіх супярэчнасьцяй

АНГЕЛЬСКІЯ ПАПРАЎКІ ДА ПАКТУ ЧАТЫРОХ

ЛЕНДАН, 8. Парыскі карэспандэнт «Дэйлі тэлеграф» паведамляе, што брытанскія папраўкі да праекту пакту чатырох дзяржаў зводзяцца да наступнага: 4 вялікія дзяржавы будуць сумесна працаваць над умацаваньнем міру. Калі будзе пастаўлена пытаньне дастасаваньня артыкулу статуту Лігі нацый аб перагляндзе дагавораў, дык іншыя заінтэрэсаваныя дзяржавы будуць прымаць удзел у перагаворах чатырох дзяржаў на розных прынцыпах. Калі будзе дасягнута згода, яна будзе перададзена на зацьвярджэньне Лігі нацый. Удзельнікі згоды чатырох дзяржаў абавязаны прынцып брытанскі праект канвэнцыі па разьбраеньні Аўстрыі, Вэнгрыі і Баўгарыі даецца роўнапраўе на такіх-жа прынцыпах, як і Германіі. Адначасова паведамляецца, што французкі мэмарандум пацьвердзіць у ліпэ больш адкрытай форме тэзісы, выкінутыя **Дэлядзе**, а іменна: супрацоўніцтва паміж 4 вялікімі дзяржавамі для забесьпячэньня міру павінна абмяжоўвацца толькі пытаньнямі, у якіх яны зьяўляюцца адзі на зацікаўленымі бакамі.

Артыкул статуту Лігі нацый аб перагляндзе дагавораў павінен быць зьвязан з артыкуламі аб тэрытарыяльнай недатыкальнасьці і незалежнасьці членаў Лігі нацый і аб санкцыях супроць парушэньня міру.

Малая Антанта адмаўляецца ад удзелу ў нарадзе чатырох дзяржаў

ЛЕНДАН, 8. Як паведамляе «Дэйлі гэральд», румынскі міністар замежных спраў **Тытулеску**, які сёньня пакідае Лёндан, заявіў Мэкдональду, што Малая Антанта ні пры якіх умовах ня будзе прымаць удзелу ў нарадах чатырох дзяржаў і што ўсякая спроба перагледзець мірныя дагаворы, згодна праекту пакту 4-х дзяржаў будзе азначаць вайну.

ПАЗШ запрашаюць Германію на падрыхтоўчую канфэрэнцыю

Візыт Норман Дэвіса ў Бэрліне

БЭРЛІН, 8. У Бэрлін прыбыў прадстаўнік ПАЗШ **Норман Дэвіс** для перагавораў па пытаньні падрыхтоўкі да міжнароднай эканамічнай канфэрэнцыі і па пытаньні аб разьбраеньні.

Як сьцьвярджае бліжні да ўраду друк, **Гітлер** у Вашынгтон не паедзе, не паедзе і **Мусаліні**. Ад імя германскага ўраду, як відаць, будзе вылучан для ўдзелу ў канфэрэнцыі новы германскі пасол у ПАЗШ **Лютэр** ці віцэ-канцлер **Папэн**.

Германскі друк, камэнтуючы прыезд Дэвіса і запрашэньне ПАЗШ, адрасаванае Германіі, прыняць удзел у падрыхтоўчай канфэрэнцыі, падкрэсьлівае, што цяпер ключ да вырашэньня асноўных міжнародных эканамічных праблем і праблемы даўгоў у руках ПАЗШ.

„Фольксштымэ" пацьвярджае сувязь Бэла з Дэтэрдынгам

ВЕНА, 8. Сацыял-дэмакратычная газэта «Фольксштымэ», якая выходзіць у Саарбруку, падае ўжо вядомыя даньня аб сувязі забітага германскімі нацыянал-сацыялістамі **Бэла з Дэтэрдынгам**, а таксама з белагвардзейцамі-фальшываманэтчыкамі **Зыгэртам і Суманскім** і украінскім белагвардзейцам **Палтаўцам-Астраніцай**.

Швэйцарскае агенцтва **«Рунаг»** суправаджае паведамленьні «Фольксштымэ» заўвагамі: «Германская сацыял-дэмакратычная партыя кампэтэнтна ў гэтых пытаньнях, бо бэрлінская паліцыя знаходзілася пад яе кантролем».

Паводле вестак агенцтва, артыкул у «Фольксштымэ» напісан выдатным супрацоўнікам бэрлінскай палітычнай паліцыі, якога Гітлер звольніў.

Газэта **«Абэнд»**, якая выходзіць у Вэне, пацьвярджаючы «з добра інфармаваных крыніц» паведамленьне аб тым, што замежны друк атрымаў ад Бэла весткі аб пажары рэйхстагу за 12 мінут да яго пачатку, піша, што нацыянал-сацыялісты прабавалі захапіць у свае рукі акты бэрлінскай пажарнай каманды, каб зьмяніць час пачатку пажару. Галоўны дырэктар пажарнай каманды і яго памочнік за адмаўленьне выдаць акты былі звольнены. «Зараз, — піша газэта, — Бэл забіт, а акты аб пажары знаходзяцца ў столькі-ж паслухмяных, колькі і верных руках».

Цеснае супрацоўніцтва вэнгерскай і германскай паліцыі

ВЕНА, 8. Вэнгерскі міністар унутраных спраў заявіў парляманту, што вэнгерская паліцыя, папярэджваючы пераход граніцы бежанцамі з Германіі, дзейнічае ў цеснай сувязі з бэрлінскай паліцыяй. У добра інфармаваных вэнгерскіх палітычных колах указваюць, што ў Бэрліне «працуе» пастаянная вэнгерская паліцэйская дэлегацыя, задачай якой зьяўляецца арганізацыя супольнай барацьбы з германскай паліцыяй супроць камуністаў.

***

ВАРШАВА, 7. Газэта «Варшаўска» паведамляе, што ў апошнія дні масавае ўцяканьне яўрэяў з Германіі значна павялічылася. Паводле падлікаў «Газэты Варшаўскай» агульны лік уцякаючых з Германіі ў Польшчу яўрэяў складае каля 12.000 чалавек.

Антыгерманскія выступленьні польскіх студэнтаў

БЭРЛІН, 8. Як паведамляе бэрлінскі друк, у Рыбніку (Польшча) група ў 200 студэнтаў накіравалася на вакзал і пры прыбыцьці цягнікоў капфіскавала ўсе нямецкія газэты. Газэты былі абліты бэнзынай і пад сьпевы польскага нацыянальнага гімну спалены.

ПАТЭРСОН ПРЫСУДЖАН ДА КАРЫ СЬМЕРЦЮ

Н'Ю-ЁРК, 9.

Як паведамляюць з Дэкатура, адзін з навольнікаў Скотсбора Патэрсон, справа якога была вылучана, прысуджан да кары сьмерцю.

Крывавая сутычка паміж рабочымі і нацыянал-сацыялістамі у Брэслаўлі

БЭРЛІН, 8. Сёньня ў **Брэслаўлі** ў 30 мясцох гораду робіцца вобыскі ў кватэрах камуністаў. У часе вобыскаў паліцыя пачала страляніну. Пакуль што адома аб двух забітых і радзе цяжка параненых. Вуліцы, на якіх праводзіцца вобыскі, абступлены паліцэйскімі і праходзіць па іх дазволена толькі з паднятымі ўверх рукамі.

Згодна паведамленьня агенцтва «Вольфа», **ноччу ў Брэслаўлі адбылася сутычка паміж нацыянал-сацыялістамі і рабочымі. Забіты два рабочыя і некалькі чалавек паранена.**

Як паведамляе агенцтва «Конты», у **Штутгарце** арыштован і дастаўлен у канцлягер у **Хайбэргу** камуніст **Чэхле**. У часе масавых вобыскаў, праведзеных у **Брэмене**, згодна паліцэйскага паведамленьня, арыштован рад актывістаў кампартыі.

***

БЭРЛІН, 8. Інфармацыйнае бюро «Фэрляг дэр Дэйчэ Цайтунг» публікуе справаздачу свайго супрацоўніка аб наведаньні ім канцлягеру ў **Хэйбэргу** (Вюртэмбэрг). У лягеры 1.750 арыштаваных — рабочыя, пастаўнікі, прафэсары, юрысты і інш. Лягер абведзен дротавымі загародкамі. Ахоўваюць лягер атрад штурмавікоў у 450 чал. і атрад вюртэмбэрскай і бадэнскай паліцыі.

Харчаваньне арыштаваных зусім мізэрнае. Сувязь з знадворным сьветам слабая. З газэт дастаўляюцца толькі газэты «нацыяналізма» напрамку. Штодзённа прыбываюць новыя вялікія партыі арыштаваных.

2.500 адвакатаў яўрэяў пазбаўлены права адвакацкай практыкі

БЭРЛІН, 8. На прыёме працаўнікоў друку ў клюбе адвакатаў (Бэрлін) урадавы камісар каморы абаронцаў **Нэйбэрт** заявіў, што ў далейшым у **Бэрліне правам адвакацкай практыкі будуць карыстацца толькі каля 900 тыс. абаронцаў нямецкага паходжэньня.** Для юрыстаў яўрэяў будзе ўведзена процантная норма, у сувязі з чым у Бэрліне змогуць атрымаць работу толькі **35 яўрэйскіх абаронцаў.** Такім чынам 2½ тысячы адвакатаў яўрэяў пазбаўляюцца сродкаў да існаваньня. У натарыяльных канторах Германіі працавала ў адвакатаў яўрэяў каля 35-40 тыс. чалавек. Амаль усе яны звольнены.

Нават орган цяжкай прамысловасьці, блізка зьвязаны з урадам, «Дэйчэ Альгемэйнэ Цайтунг» піша, што «выступленьне супроць яўрэйскіх абаронцаў, бясспрэчна, зьяўляецца адным з найбольш вострых мерапрыемстваў улады ў адносінах пасобных прафэсій».

Усегерманскае аб'яднаньне абаронцаў і служачых натарыяльных кантор выказалася супроць процантнай нормы для яўрэяў адвакатаў.

Фашысцкая чыстка дзяржаўных і муніцыпальных устаноў Германіі

БЭРЛІН, 8. Апублікован і ўступіў у сілу новы закон аб дзяржаўных і муніцыпальных служачых. Закон указвае, што ў далейшым на дзяржаўнай муніцыпальнай службе могуць быць толькі немцы, што «чыноўнікі Арыйскага (маецца на ўвазе яўрэйскага) паходжэньня павінны быць звольнены ў адстаўку. Закон прадугледжвае звальненьне ўсіх «палітычна-ненадзейных» дзяржаўных і муніцыпальных служачых.

Забастоўка рабочых заводаў Сітроена працягваецца

Дырэкцыя абвясьціла лёкаут

ПАРЫЖ, 7. Як паведамляе «Юманітэ», рабочыя заводаў Сітроена выстанілі мощныя стачачныя пікеты і перашкодзілі адваўленьню работы, а таксама зьнялі з работы ўсіх, хто працаваў на заводах у **Левалуа**. На заводзе ў раёне **Мішле** дырэкцыя забарыкадавала ўваходы ў майстэрні, але рабочыя, узламаўшы дзьверы, зьнялі з работы ўсіх, хто знаходзіўся ў майстэрнях.

За распаўсюджваньне лістовак арыштаваны 3 рабочыя. На заводах у раёне **Клішы і Жавель** бастуючыя дабіліся тых-жа вынікаў. Прыкметна расьце баявы настрой жанчын, удзел якіх у стачачных пікетах і сходах усё больш павялічваецца.

Дырэкцыя абвясьціла новы лёкаут на ўсіх заводах, тэрмінам да 18 красавіка.

Напад германскіх штурмавікоў на кватэру чэскага рабочага

ПРАГА, 8. 6 красавіка ноччу атрад германскіх пацыянал-сацыялістскіх штурмавікоў перайшоў чэха-славацкую граніцу і ўварваўся ў кватэру рабочага ў **Крэйвіцы**. Штурмавікі зьбілі сям'ю рабочага, захапілі эмігранта—германскага камуніста **Марціна**, які знаходзіўся на яго кватэры. Марціна павезьлі на аўтамабілі ў Германію. У налёце прынялі ўдзел таксама мясцовыя крэйвіцкія нацыянал-сацыялісты.

РОСТ БЕСПРАЦОЎЯ Ў КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІНАХ

БЭРЛІН, 6. «Бэрлінэр Тагеблят» публікуе даньня міжнароднага бюро працы пры Лізе нацый аб стане сусьветнага беспрацоўя за першы квартал бягучага году. У большасьці краін лік беспрацоўных за першы квартал бягучага году ў параўнаньні з тым-жа пэрыядам мінулага году павялічыўся: у ЭСТОНІІ і ШВЭЦЫІ на 27 проц., ЧЭХА-СЛАВАКІІ на 61 проц., БЭЛЬГІІ на 35 проц., ДАНІІ на 30 проц., ГАЛЯНДЫІ на 26 проц., ШВЭЙЦАРЫІ на 25 проц. У радзе краін, як, напрыклад, у АЎСТРЫІ, ФІНЛЯНДЫІ, ФРАНЦЫІ, АНГЛІІ, ІТАЛІІ, НАРВЭГІІ, ДАНЦЫГУ, гэты процант росту беспрацоўя крыху ніжэйшы.

Толькі ў 4-х краінах—ГЕРМАНІІ, АЎСТРЫІ, КАНАДЗЕ і ПОЛЬШЧЫ — афіцыяльныя даньня міжнароднага бюро працы канстатуюць скарачэньне беспрацоўя ў параўнаньні з першым кварталам мінулага году. Аднак, паводле даных гэтага-ж міжнароднага бюро працы, скарачэньне беспрацоўя ў Германіі і Польшчы трэба прыпісаць выключна тэй акалічнасьці, што «ШМАТ ЯКІЯ БЕСПРАЦОЎНЫЯ ЎЖО БОЛЬШ НЕ АТРЫМЛІВАЮЦЬ НІЯКАЙ ДАПАМОГІ І ТАМУ ВЫКРЭСЬЛЕНЫ СА СЬПІСАЎ БЕСПРАЦОЎНЫХ». Справаздача бюро таксама гаворыць, што даньня па некаторых краінах ахапляюць толькі тых беспрацоўных, якія атрымліваюць афіцыяльную дапамогу.

Бюро ня ўлічвае, аднак, вялізарных мас беспрацоўных, якія не зарэгістраваны на біржах працы і не карыстаюцца ніякай дапамогай. Даньня міжнароднага бюро працы таксама ня ўлічваюць вялізарных мас рабочых, якія працуюць скарочаны рабочы тыдзень. Між тым пік такіх рабочых, паводле вестак газэт, за апошні год значна павялічыўся. У процантных адносінах да ліку занятых на прадпрыемствах рабочых колькасьць беспрацоўных, паводле тыхжа даных, складае ў ГЕРМАНІІ 33 проц., у АЎСТРЫІ 32,1 проц. і ў АНГЛІІ 22,8 проц.

12 красавіка пачынаецца працэс шкоднікаў на электрастанцыях

МАСКВА, 9. 8 красавіка раніцою скончана перадача копіі абвінавачэньня заключэньня абвінавачаным па справе аб шкодніцтве на электрастанцыях і пракуратура РСФСР перадала справу ў распараджэньне Вярхоўнага суда СССР.

Слуханьне справы назначана на 12 гадз. дня 12 красавіка.

ПАПРАЎКІ

У перадавым артыкуле **«Не запалохаюць»**, зьмешчаным у «Зьвязьдзе» № 78 ад 9-IV—33 г., у выніку кепскай перадачы па радыё з Масквы дапушчаны недакладнасьці і памылкі:

У першым абзацы, у 10 радку замест слова—«тэкстам» патрэбна—«тэзісам»; у тым-жа абзацы, 63 радку зьверху замест слова—«тут», трэба—«у суд»; у перадапошнім радку гэтага-ж абзацу замест—«забітае», патрэбна—«зьбітае».

У другой калёнцы, першым абзацы, 10 радку замест—«прыклад зьрашэньня», патрэбна—«прыклад разбурэньня»; у гэтым-жа абзацы, 22 радку патрэбна замест—«аб выраішэньні»—**«аб разбурэньні»**; у 35 радку гэтага абзацу замест—«спецыяльных»—патрэбна **«сацыяльных»**.

***

У артыкуле **Н. Ленцнэра—«Асноўнае зьвяно ў барацьбе за бальшавіцкую калгасную сяўбу»**, у 5 калёнцы, 2 абзацы, 5 радку замест—«аб старых», патрэбна—«аб сьціслых», тое-ж самае і ў апошняй калёнцы, трэцім абзацы зьнізу, у 17-м радку, замест—«старыя», патрэбна—«сьціслыя».

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ПАСТАНОВА № 184

Калегіі Народнага Камісарыяту Зямляробства БССР ад 5-IV 1933 г.

Аб ходзе складаньня вытворчых плянаў і арганізацыі пастаянных брыгад у калгасах Мазырскага, Менскага, Дзяржынскага і Полацкага раёнаў

Заслухаўшы даклады загадчыкаў райза Мазырскага—т. **Радзівіновіча**, Менскага — тав. **Якубовіча**, Дзяржынскага — тав. **Забалоцеца**, дырэктара 1-й Менскай МТС тав. **Шэлега**, пам дырэктара Ветрынскай МТС тав. **Барэвіцкага**, старшыні калгасу «Варашылава», Мазырскага раёну і брыгадзіра гэтага калгасу тав. **Бобра** і старшыні калгасу імя 9 студзеня, Дзяржынскага раёну тав. **Векша**, калегія НКЗБ **канстатуе:**

1. Поўную адсутнасьць кіраўніцтва з боку райза і МТС работай па складаньні вытворчых плянаў і арганізацыі пастаянных брыгад (Мазырскі, Менскі раёны).

2. У складзеных калгасамі вытворчых плянах запраектавана зьніжаная супроць кантрольных заданьняў ураджайнасьць на 1933 г., зусім не прадугледжаны агратэхнічныя мерапрыемствы, тэрміны сяўбы, па ўстаноўцы райза і МТС, вызначаныя па вытворчых плянах калгасаў у 27-33 дні. (Менскі раён).

3. Большасьць складзеных калгасамі плянаў па гэтых раёнах не разгледжаны і не зацьверджаны райза і МТС, а па Менскім раёне (1-я МТС) праштампованы вытворчыя пляны калгасаў, у якіх дапушчаны шкодныя ўстаноўкі і зьніжэньне кантрольных лічбаў на ўраджайнасьць, расьцягнутасьць сяўбы на 27-33 дні і г. д.

4. Вытворчыя брыгады ў калгасах арганізаваны фармальна, без дачы вытворчых заданьняў, многія брыгады ня ведаюць сваіх вытворчых вучасткаў, коні і інвэнтар унутры брыгад не замацованы за паасобнымі калгасьнікамі (Мазырскі, Дзяржынскі, Менскі, Полацкі раёны).

5. Зусім невыстарчальна разгортваецца работа па ўвядзеньні севазваротаў у калгасах, запраектаваныя ў калгасах севазвароты ў большасьці не зацьверджаны райза (Менскі, Мазырскі, Дзяржынскі раёны).

Калегія НКЗБ лічыць, што такое становішча са складаньнем вытворчых плянаў, арганізацыяй брыгад, і ўвядзеньнем севазваротаў па Менскім, Мазырскім, Дзяржынскім і Полацкім раёнах зьяўляецца вынікам недаацэнкі з боку зямельных органаў гэтых раёнаў важнейшага значэньня гэтых мерапрыемстваў у справе забесьпячэньня пасьпяховага правядзеньня веснавой пасеўкампаніі, уздыму ўраджайнасьці і сьведчыць аб тым, што райза і МТС не зразумелі ўказаньня ЦК і СНК, у пастанове ад 9 сакавіка, аб тым, што, «пастаянная вытворчая брыгада будзе рашаць посьпехі веснавой сяўбы, ад яе работы будуць залежаць вынікі барацьбы за высокі ўраджай і прыбытак калгасаў і калгасьнікаў, правядзеньне ў жыцьцё лёзунгу тав. Сталіна — «зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі».

Калегія НКЗБ **пастанаўляе:**

1. Прапанаваць **райза і МТС** Менскага, Мазырскага, Дзяржынскага і Полацкага раёнаў неадкладна ўзмацніць работу па складаньні вытворчых плянаў, арганізацыі брыгад так, каб скончыць гэту работу ў бліжэйшыя дні.

2. Загадчыкам райза і дырэктарам МТС пералічаных раёнаў безадкладна праверыць складзеныя калгасамі вытворчыя пляны і ў кожным выпадку дапушчаных скажэньняў і памылак накіраваць спецыяльных работнікаў у гэтыя калгасы для выпраўленьня. **Аб выкананьні гэтага** паведамць калегіі **НКЗБ** спецыяльнымі дакладнымі запіскамі **не пазьней 15 красавіка 1933 г.**

3. Узмацніць работу па ўвядзеньні севазваротаў у калгасах, неадкладна разгледзець ужо ўведзеныя ў калгасах севазвароты і забясьпечыць перанясеньне ўстаноўленых севазваротаў у натуру і выдзяленьне вытворчых вучасткаў для брыгад у палёх севазваротаў.

4. Адзначаючы зусім нездавальняючае становішча са складаньнем вытворчых плянаў, арганізацыяй брыгад, увядзеньнем севазваротаў па большасьці раёнаў БССР, што ставіць пад пагрозу зрыву пасьпяховае правядзеньне веснавой пасеўкампаніі, Калегія НКЗБ папярэджвае райза і МТС, што ў адносінах тых раёнаў, якія не забясьпечаць у бліжэйшыя дні пералому ў гэтай справе, будуць прыняты суровыя меры ўзьдзейнічаньня.

5. Менскі раён, пры наяўнасьці навуковых устаноў, наяўнасьці 15 агрономаў у райза і МТС, вялікай колькасьці мабілізаваных спецыялістаў, дапамогі шэфскіх арганізацый і асаблівай увагі гэтаму пытаньню з боку гаркому КП(б)Б і Гарсавету, павінен быў зьявіцца вядучым раёнам у справе своячасовага складаньня вытворчых плянаў і арганізацыі сталых брыгад у калгасах. Аднак, ня гледзячы на гэта, Менскі гарэ не забясьпечыў своячасовага і поўнага выкананьня дырэктыў ЦК і СНК па гэтым пытаньні, за што загадчыку Менскага гарэ тав. **Якубовічу** абвясьціць суровую **вымову** і паставіць пытаньне перад Менскім Гаркомам КП(б)Б аб мэтазгоднасьці застаўленьня яго на рабоце.

Дырэктару 1 менскай МТС тав. **Шэлегу** за штампаваньне вытворчых плянаў калгасаў, у якіх дапушчаны шкодныя ўстаноўкі, і адсутнасьць кіраўніцтва работай па арганізацыі брыгад, **абвясьціць вымову.**

6. Папярэдзіць загадчыкаў райзаў Мазырскага — тав. **Радзівіновіча** (вынесена вымова па пастанове ад 29 сакавіка 1933 г. за непрадстаўленьне вестак аб ходзе складаньня вытворчых плянаў і арганізацыі брыгад), Дзяржынскага — тав. **Забалоцеца** і дырэктара Ветрынскай МТС — тав. **Шкурдзе**, што калі яны не забясьпечаць поўнага выкананьня ў бліжэйшыя дні дырэктыў ЦК, СНК і Наркамзему аб складаньні вытворчых плянаў і арганізацыі брыгад, яны будуць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

7. Абавязаць праўленьне калгасу імя Варашылава, Мазырскага раёну, скончыць у бліжэйшыя дні складаньне вытворчага пляну і выдаць брыгадам галавыя заданьні.

Брыгадзіру калгасу імя Варашылава тав. **Бобру** неадкладна прапрацаваць атрыманае ад праўленьня гадавое заданьне па вытворчай нарадзе брыгады, азнаёміць усіх калгасьнікаў брыгады з пастаўленымі перад імі задачамі, замацаваць за калгасьнікамі коняй, збрую, машыны і ўвесь інвэнтар, выдаўшы кожнаму гэтую маемасьць пад расьпіску, з указаньнем яе становішча.

Нарком зямляробства БССР РАЧЬЦКІ.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Ад 10 красавіка

НОВАЯ САВЕЦКАЯ МАСТАЦКАЯ КАМЭДЫЯ выпуску 1933 году

ШУКАЮ ПРАТЭКЦЫЮ

— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —

кіно-хроніка САЮЗКІНО.

ЛЕПШАЯ КАМЭДЫЯ СЭЗОНУ

Штодзённа 4 сэансы

Пачатак у 6, 7-30, 9 і 10-30.

Каса ад 1 гадз. дня.

Першы Дзярж. Тэатр (БДТ-І)

СЁНЬНЯ МОСТ

ПАЧАТАК у 8 гадз. вич.

Дацячы гукавы КІНО-ТЭАТР Касе з 12 г. дня. З 1 красавіка новы мастацкі фільм РАЗАМ з БАЦЬКАМІ

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса—з 2 г. дня ЗАКОН І АБАВЯЗАК (АМОК) драма ў 6 ч.

ПРАЛЕТАРЫ Мастацкі фільм РАЗЛОМ

„СПАРТАК" Каса—ад 2 г. 30 х. Замежны мастацкі фільм ДЗЯЎЧЫНА-БЯЗБОЖНІЦА драма ў 10 часках.

АНОНСІ НОВЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ КІНО-РАМАН Вытворчасьці Белдзяржкіно СЛАВА СЬВЕТУ

БЕЛДЗЯРЖЛУГТРЭСТАМ

праводзіцца

ПРОДАЖ СЕНА

ўкосу 1932 году, якое знаходзіцца як пры станцыях чыгуніі, так і ў глыбінных пунктах лугсаўгасаў трэсту.

Сена адпускаецца дзяржаўным і кааперацыйным арганізацыям.

За даведкамі зварачацца: Менск, Савецкая, 57, пакой №4, Белдзяржлугтрэст тэл. № 20-700.

Дырэкцыя трэсту.

ЖЫЛКАМЭРА Нарсуда г. Менску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. НЕСЬЦЮКУ Пятру Сьцяфанаву, жыхару г. Менску, Чырвонаармейская, 13, згодна прыгавору суду ад 14-2-33 г.

Даводзіцца да ведамаўсіх лекавых устаноў Беларусі,

што хворыя з раёнаў на стацыянарнае лячэньне клінік гораду па ўнутраных, хірургічных, скура-венэрычных і гінекалёгічных хваробах

могуць быць накіраваны

ВЫКЛЮЧНА ПАСЬЛЯ ПАПЯРЭДНЯГА ЗАПЫТАНЬНЯ

адпаведнай клінікі або эвакопрыёмніка гораду.

Дырэкцыя.

І Менскі будвучастак пры БКС

з 15 красавіка

ЛІКВІДУЕЦЦА.

Прэтэнзіі просьба прад'яўляць да 15 красавіка, пасьля якога тэрміну прэтэнзіі прыймацца ня будуць.

Ліквідыюм.

11 красавіка, у 6 гадз. веч., адбудзецца

ПАСЯДЖЭНЬНЕ ІНСТЫТУТУ ГІСТОРЫІ

Беларускай Акадэміі Навук, прысьвечанае гадавіне сьмерці М. Н. ПАКРОЎСКАГА.

На пасяджэньні будзе заслухан даклад тав. Кірпічова на тэму:

„ПАКРОЎСКІ ЯК ГІСТОРЫК НАРОДАЎ СССР".

Запрашаюцца настаўнікі, студэнты, навуковыя работнікі і ўсе жадаючыя.

Рэдакцыя часопісі

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"

(палітычна-эканамічны орган ЦК КП(б)Б) даводзіць да ведама падпісчыкаў і чытачоў нашага часопісу, што затрымка ў своячасовым выхадзе за люты месяц 1933 г. часопісу „Б. Б." будзе ліквідавана на працягу бліжэйшых дзён.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" за люты мц выйдзе ў красавіку, далейшая запазычанасьць у выхадзе канчаткова будзе ліквідавана на працягу красавіка—мая месяцаў 1933 году.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" у далейшым будзе рэгулярна і своячасова выходзіць з друку і рассылацца падпісчыкам.

Падпіска на часопісь „БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" на 1933 год працягваецца.

Просьба своячасова адзавіць падпіску на далейшыя месяцы, каб забясьпечыць аккуратнае і бесперабойнае атрыманьне часопісу.

Падпісная цана на 1933 год:

на 1 месяц . . . 50 кап.
„ 3 „ . . . 1 р. 50 кап.
„ 6 „ . . . 3 р.
„ 1 год . . . 6 р.

Падпіска прымаецца ўсімі паштовымі аддзяленьнямі і ўпаўнаважанымі па друку пры партарганізацыях.

Выдавецтва ЦК КП(б)Б „Зьвязда".

Прапойскае аддзяленьне Дзяржбанку

ПРАДАЕ

цэглу ў колькасьці 85.000 шт. на 7.200 руб за наўплату ў тэрмін павыкі цэглянай арцельяю.

БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК

ВЫДАВЕЦТВА

ДА ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ

1-га году другой пяцігодкі

Выйшлі з друку і паступілі ў продаж:

Афанасьеў акад.—Глебавыя раёны БССР, стар. 62, ц. 2 руб.

Афанасьеў акад.—Асноўныя рысы глебавага твару зямлі (тэкст на беларускай, рускай і нямецкай мовах), стар. 84, ц. 3 руб.

Арцееў—Кандрацьеўшчына і барацьба партыі супроць правага і «левага» ўхілаў у аграрным пытаньні. Сьценаграма дэкадніка камакадэміі, стар. 46, ц. 55 к.

Бахцееў — Шырэй скарыстаем торф. Падручнік для агрономаў, торфмайстраў, брыгадзіраў калгасаў і саўгасаў, стар. 32, ц. 45 к.

Ганчарык — Мэтад калгаснага вызначэньня антоцыяніну ў лісьцях расьлін, побач з колькасным вызначэньнем пігмэнтаў пратаплязмы, стар 8, ц. 5 к.

Ганчарык—За культуру соі ў БССР, стар. 26, ц. 20 к.

Ганчарын — Аб культуры соі ў БССР, стар. 16, ц. 15 к.

Ганчарык—Уплыў ультра-фіалкавых праменьняў на ўтварэньне антоцыяніну ў расьлінах, стар. 62, цана 1 р. 50 к.

Ганчарык і Дарошкін—Прычыны гібелі азімага збожжа і мерапрыемствы па яе папярэджаньні, стар. 42, ц. 15 к.

Дамарацкі—Асноўныя пытаньні арганізацыі сацыялістычнага земляробства ў калгасах, стар. 108, цана 1 руб.

Дарошкін—На барацьбу з бульбяным грыбком, стар. 16, ц. 10 к.

Дарошкін—Першая спроба фітапаталёгічнага-энтамалёгічнага абсьледваньня бульбы ў СССР в мэтай дзяржаўнага карантыну, стар. 148, цана 75 к.

Дарошкін—Спосабы змаганьня з хваробамі гародніх і садовых культур, стар. 64, ц. 30 к.

Дарошкін і Рэўда—Параённая характарыстыка захворваньня бульбы ў БССР, стар. 160, ц. 2 р. 50 к.

Міхайлоўская—Паплавы і сенажаці, стар. 36, ц. 40 к.

Міхневіч—Лес і ўраджай, стар. 16, цана 15 к.

На барацьбу за ахову ўраджаю азімых (вынікі нарады АН па пытаньні „уплыву зімы на ўраджай"), стар. 10, ц. 5 к.

Сяргеева—Шкоднікі буйнай рагатай жывёлы і барацьба з імі, стар. 16, ц. 15 к.

Сяргеева—Хімія ў барацьбе са шкоднікамі, стар 16, ц. 30 к.

Уплыў кліматычных умоў зімы БССР на ўраджай, стар. 72 цана 75 кап.

Друкуюцца і хутка паступяць у продаж:

Беларуская Акадэмія Навук у барацьбе за ўздым ураджайнасьці.—Працы сэсіі АН 20-24 сьнежня 1932 г., стар. 320.

Апанасьеў—Як павысіць ураджайнасьць на глебах БССР, стар. 16.

Альсьлік і Ганчарын — Дынаміка росту бульбы, стар. 80.

Булганоў—Як правесьці палявыя досьледы ў калгасах і саўгасах, стар. 32.

Васільлева—Шкоднікі буракоў, стар. 48.

Гельлер—Аб лёгачных і цяглечных гельмінтозах у сьвіней, стар. 48.

Гінзбург—Скарыстаньне торфу ў сельскай гаспадарцы, стар. 16.

Горскі і Цэторман—Да пытаньня аб новых кармавых расьлінах, стар. 48.

Зборнік рэд. **Ганчарыка**—Соя ў БССР, стар. 160.

Кірэйчык—Мікробы і іх значэньне, стар. 64.

Левітман і Лысянкой—Хімія ў барацьбе з шкоднікамі ў сельскай гаспадарцы, стар. 24.

Саноцкі—Апрацоўка глебы, як сродак павышэньня ўраджайнасьці, стар. 24.

Стэфін—Мінэральныя ўгнаеньні, стар. 16.

ПРОДАЖ усіх выданьняў Беларускай Акадэміі Навук утварэецца ва ўсіх кнігарнях ДЕБ, БАКТ'у і Райспажыўсаюзаў.

ДОМ КАМАСЬВЕТЫ (рог Карла Маркса і Энгельса).

11 красавіка, роўна ў 7 гадз. вечара адбудзецца

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ ЗЬЛЁТ

слухачоў партыйных школ і гурткоў.

Парадак дня: Задачы агляду-конкурсу сеткі партыйнай асьветы. Культпропам парткалектываў і ячэек забясьпечыць яўку.

Культпроп Менгаркому КП(б)Б.

10-га КРАСАВІКА, у 6 гадзін вечара, у п мэшканьні кнюбу гарэтаку (пляц Волі, 4)

адбудзецца

СХОД УСІХ ЗАГАДЧЫКАЎ ДАМАЎ

гаржылсаюзу, жылтрэсту, камэндантаў устаноў і дворнікаў гор. Менску.

На сход павінны зьявіцца прадстаўнікі самагляду і аддзелу дабрабыту гораду.

Аргмасавы Аддзел Менгарсавету.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА, што

гарадзкімі аддзяленьнямі міліцыі гор. Менску

з 10-га па 25-га КРАСАВІКА

ВЫТВАРАЕЦЦА

ВЫДАЧА НОВЫХ НУМАРНЫХ ЗНАКАЎ

на 1933 г. для легкавых, грузавых ізвозчыкаў

як прыватным асобам, так і дзяржаўным установам, а таксама і для ВЭЛЁСЫПЭДАЎ.

Асобы і ўстановы, якія займаюцца ізвозам і маюць вэлёсыпэды, павінны АТРЫМАЦЬ НУМАРЫ ў адпаведным аддзяленьні міліцыі ў паказаны тэрмін.

пасьля якога ЯЗДА па гораду се старымі нумарамі або без нумароў забараняецца і знятыя будуць прыцягвацца да адміністрацыйнай адказнасьці.

Галоўнае кіраўніцтва РС міліцыі пры СНК БССР.

У аддзел аб'яў званеце па тэлефону 21-885

Менск, друкарня «Зьвязды». Галоўлітбел № 337.